Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 ЛІПЕНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 130 (28240)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




**Абітурыент-2016**

СТАР. 4



**Бясцэнныя скарбы Палесся**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр БАГДЗЕВІЧ, намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта:**
*«Сёння Дзяржаўны мытны камітэт Рэспублікі Беларусь прымае неабходныя меры па стварэнні спрыяльных умоў для развіцця знешняга гандлю і ўмацавання нацыянальнага бізнесу з аднаго боку, і ў той жа час праводзіць дасканалы мытны кантроль для забеспячэння эканамічнай бяспекі дзяржавы і грамадства з другога. Вырашыць дзве задачы адначасова магчыма дзякуючы зрушэнню акцэнту правядзення мытнага кантролю са стадыі выпуску тавараў на наступны перыяд (пасля іх выпуску). Выбар аб'ектаў постмытнага кантролю ажыццяўляецца выключна на аснове сістэмы кіравання рызыкамі і толькі ў тых выпадках, калі сапраўды высокая верагоднасць невыканання заканадаўства».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 8.07.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0121 | ▼ |
| Еўра | 2,2290 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0314 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0811 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Бацькава навука



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Майстар лозапляцення з вёскі Заеліца Глускага раёна, член Беларускага саюза майстроў Аляксей МЕСНІК у гэтыя летнія дні не толькі займаецца вырабам традыцыйных і сувенірных кашоў і кошыкаў, але і вучыць свайго 7-гадовага Яна асновам старажытнага рамяства. Хлопчык у час летніх канікулаў спасцігае нялёгкую бацькаву навуку.**

СТАР. 5

■ Лад жыцця

## САЛОДКАЕ ДЛЯ БАБУЛІ

### Што варта рабіць пасля 40 і ад чаго не трэба адмаўляцца пасля 70?

**У біялагічным сэнсе мы пачынаем старэць літаральна пасля 25. З гэтага моманту ўсе сістэмы арганізма пачынаюць павольна здаваць пазіцыі. Праўда, ва ўсіх іншых сэнсах мы цудоўна разумеем, што бліжэй да 30-ці жыццё толькі пачынаецца. І тым не менш нас хвалюе пытанне, як даўжэй захаваць маладосць цела і бадзёрасць духу. А раптам і намагацца асабліва не варта — можа, вынайдзена ўжо чароўная пілюля ад старасці? Загадчык кафедры геранталогіі і герыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Аляксандр БАЙДА лічыць, што такая пілюля, несумненна, ёсць — здаровы лад жыцця!**



— Працэс старэння складаны і шматбаковы. У праграме работы любой клеткі ад пачатку закладзена яе гібель. Феномен апаптозу — запраграмаванай гібелі клетак — заключаецца ў тым, што пастуапова іх становіцца менш, структура і функцыя органа змяняюцца, ён завядае. На месцы загінуўшай клеткі можа ўзнікнуць новая (калі орган развіваецца і расце), а можа і не ўзнікнуць (калі мы старэем). Гэта нармальны біялагічны працэс. Арганізм чалавека — неверагодна вялікая колькасць клетак і велізарная колькасць праграм дзейнасці кожнай клеткі. Прырода жыцця настолькі складная, што наўрад ці ў блізкі час гэта тайна будзе да канца разгадана. Хоць у апошні час зроблены каласальныя зрухі ў вывучэнні многіх працэсаў. Для нас сёння важным будзе звярнуць увагу на тое, чым можа і павінен кіраваць чалавек.

СТАР. 13

■ «Гарачы» тыдзень

## Сем дзён, каб вызначыцца з прафесіяй

### 14 ліпеня інфармаванне абітурыентаў спыніцца а 15 гадзіне!

**Сёння прыёмныя камісіі вышэйшых навучальных устаноў распачнуць прыём дакументаў у абітурыентаў.**

У параўнанні з папярэднім годам тэрміны прыёму дакументаў на бюджэтную форму навучання былі скарочаны сёлета на адзін дзень: прыёмныя камісіі чакаюць абітурыентаў да 14 ліпеня. А з 15 ліпеня распачынаюцца ўступныя выпрабаванні, якія праводзяцца непасрэдна ва ўстановах адукацыі. Маюцца на ўвазе экзамены па творчасці, фізічнай культуры, а таксама экзамены для абітурыентаў, якія паступаюць на аснове сярэдняй спецыяльнай адукацыі на скарочаныя тэрміны навучання. Уступныя іспыты арганізаваны толькі ў адну сесію: як для асоб, якія паступаюць за кошт сродкаў бюджэту, так і на платнай аснове.

### НОВЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

У 2016 годзе на ўсе формы навучання ў вышэйшыя навучальныя ўстановы плануецца прыняць больш за 63 тысячы чалавек — гэтая лічба неістотна адрозніваецца ад леташняй. За кошт сродкаў бюджэту будуць атрымліваць адукацыю ў ВНУ каля 28 тысяч чалавек (з іх на дзённай форме навучання — 22,6 тысячы). У прыватныя ВНУ плануецца прыняць 8,2 тысячы чалавек.

СТАР. 4

# Абарона ад любой небяспекі

**Вынікі работы сілавога блока краіны за паўгоддзе абмеркаваны ў ходзе сустрэчы Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі з дзяржсакратаром Савета Бяспекі Станіславам Засем.**

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся бягучай сітуацыяй у рабоце сілавых ведамстваў і тымі праблемамі, якія існуюць. У прыватнасці, Прэзідэнт спытаў аб выніках нядаўна праведзенай сістэмнай праверкі ў пагранічных войсках, у ходзе якой былі не толькі адзначаны станоўчыя моманты, але і выяўлены недахопы.

Аляксандр Лукашэнка таксама пацікавіўся меркаваннем Дзяржсакратарыята наконт аптымізацыі сілавога блока краіны. Прэзідэнт у якасці прыкладу прывёў Узброеныя Сілы: «Мы дамаўляліся, што там будзе не больш як 65 тыс. чалавек. Тое, што мы абяцалі, трэба рабіць, пры гэтым не сумнявацца, што абараназдольнасць у нас павінна быць на адпаведным узроўні».

Прэзідэнту былі далажаны асноўныя вынікі работы сілавых ведамстваў, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. У цэлым сілавыя структуры забяспечылі неабходныя ўмовы для ўстойлівага функцыянавання дзяржаўных, грамадскіх інстытутаў, а таксама правапарадак, абарону інтарэсаў і правоў грамадзян краіны.

У ходзе сустрэчы вялікая ўвага была ўдзелена забеспячэнню бяспекі грамадзян і абароне іх ад небяспекі тэхнагеннага, прыроднага характару, што асабліва актуальна з улікам умоў надвор'я ў апошнія месяцы. Як далажыў дзяржсакратар, дасягнуты станоўчыя вынікі па ўсіх асноўных напрамках дзейнасці — гэта датычыцца забеспячэння правапарадку, недапушчэння росту злачыннасці (дзе яе зніжэнне), бяспекі на дарогах і абароны людзей ад пажараў, на вадаёмах.

Кіраўнік дзяржавы ў цэлым станоўча ацаніў вынікі работы сілавых структур за гэты перыяд. Пры гэтым прынята рашэнне, што вынікі праверкі пагранведамства будуць разгледжаны на асобнай нарадзе з удзелам Прэзідэнта.

## ■ Па-суседску

# Наша краіна і надалей будзе развіваць супрацоўніцтва з Літвой

**Гэта адзначыў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Літвы ў Беларусі Эвалдасам Ігнатавічусам з нагоды завяршэння яго дыпламатычнай місіі ў нашай краіне.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сустракаецца з тымі пасламі, «якія ўнеслі вялікі ўклад у развіццё адносін, працавалі так, як мае быць, на ўмацаванне двухбаковых сувязяў і зрабілі нямала за перыяд сваёй службы для збліжэння народаў». «Вас я адношу да такіх пасլоў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама адзначыў: «Вы абцяжараныя нейкімі абавязацельствамі з боку сваіх партнёраў у Еўрапейскім саюзе, НАТА і гэтак далей. І вы ведаеце нашу сітуацыю, мы таксама маем свае абавязацельствы перад нашымі партнёрамі. Але, тым не менш, мы заўсёды знаходзілі шлях да разумення, і той шлях, па якім гатовы ісці сумесна».

Пасол, у сваю чаргу, запэўніў, што Літва будзе садзейнічаць паляпшэнню стасункаў Беларусі з ЕС, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. «У нас агульнае гістарычнае мінулае, агульная, я спадзяюся, і будучыня ў пашыранай бяспечнай Еўропе», — заявіў дыпламат. Ён падкрэсліў, што Літва вельмі цэніць Беларусь як суседа, як вельмі важную рэгіянальную дзяржаву, а таксама за намаганні па ўсталяванні міру і добрасуседства ў рэгіёне. «Мы будзем старацца ісці і далей па шляху добрасуседства і развіцця адносін як на двухбаковым узроўні, так і па лініі Беларусь — ЕС», — заявіў Эвалдас Ігнатавічус.

## ■ Парламенцкі дзённік

# СЯБРОЎСТВА РЭГІЁНАМІ

**Беларуска-французскі форум рэгіёнаў можа прайсці ў Мінску ў наступным годзе. Такую прапанову выказаў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ на сустрэчы з дэлегацыяй групы сяброўства «Францыя — Беларусь» Нацыянальнай асамблеі Французскай Рэспублікі.**

— Гэта перазагрузіць тыя дагаворныя адносіны, якія ўжо ёсць, — адзначыў кіраўнік верхняй палаты, — таму што пабрацімскія сувязі і дагаворы аб сяброўстве і супрацоўніцтве існуюць, але яны носяць лакальны характар. Хацелася б надаць эфектыўнасці і дынамізму нашаму рэгіянальнаму супрацоўніцтву.

Спікер Савета Рэспублікі занепакоены становішчам у эканамічным супрацоўніцтве. Летась тавараабарот паміж Беларуссю і Францыяй знізіўся, і па выніках першага квартала гэтага года негатыўная тэндэнцыя захавалася. Развіццё рэгіянальнага партнёрства можа стымуляваць нармалізацыю двухбаковага гандлю, лічыць ён.

Таксама з дэлегацыяй групы дружбы «Францыя — Беларусь» Нацыянальнай асамблеі Францыі на чале са старшынёй групы Нікаля Дз'юікам сустрэўся **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віталь БУСЬКО**.

Па словах Віталя Бусько, еўрапейскі вектар зараз актуальны для нашай краіны. Напярэдадні выбараў у парламент Беларусі ўжо былі накіраваны запрашэнні для назірання у ПАСЕ і ПА АБСЕ, дзе Францыя адыгрывае важную ролю. Таксама дэпутат адзначыў, што міжпарламенцкія адносіны Беларусі і Францыі развіваліся па-рознаму, але цяпер ўзаемадзеянне актывізавалася, а візіт французскай дэлегацыі толькі пацвярджае гэта. Паводле яго слоў, групы дружбы ў парламентах — гэта масты, якія злучаюць народы, а затым эканомікі краін. Таксама ён выказаў падзяку дэлегатам за тую ролю, якую Францыя адыграла ў адмене абмежаванняў і санкцый у дачыненні да Беларусі.

Каментуючы прапанову старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіла Мясніковіча па правядзенні форуму рэгіёнаў Беларусі і Францыі ў нашай краіне налета, Нікаля Дз'юік адзначыў, што гэта выдатная ідэя.

Таксама ён дадаў, што дэлегацыя ўжо дамовілася з беларускімі парламентарыямі пра ўзмацненне ўзаемадзеяння і больш рэгулярныя сустрэчы. Ён паведаміў, што ў французскіх рэгіёнах ёсць прадпрыемствы, якія займаюцца высокімі тэхналогіямі, у прыватнасці, гэта сфера атамнай энергетыкі, стварэнне камп'ютарных праграм, аэракасмічная галіна. Беларусь таксама мае дасягненні ў сферы інфармацыйных тэхналогій, што выклікае цікавасць Францыі да супрацоўніцтва.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zvazda.by,* **Надзея АНІСОВІЧ**

■

# ПАДРУЧНІКІ ПА ВЫБАРАХ

## За поўную якасную інфармацыю Цэнтрвыбаркаму дзякуюць нават апазіцыянеры

**Учора адбыўся семінар-вучоба членаў акруговых выбарчых камісій Мінскай вобласці па пытаннях падрыхтоўкі і правядзення выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі шостага склікання. У ім прыняла ўдзел старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына. Перад пачаткам мерапрыемства яна адказала на пытанні журналістаў.**



Ініцыятыўныя групы ўжо распачалі працу па зборы подпісаў.

Лідзія Міхайлаўна, у прыватнасці, адзначыла, што такія семінары сталі ўжо традыцыйнымі з пачатку 1990-х гадоў, з таго часу, як стварылася Цэнтральная выбарчая камісія. Па словах старшыні Цэнтрвыбаркама, гэтыя непасрэдныя сустрэчы з арганізатарамі выбараў яны цэняць, для іх гэта магчымасць зразумець атмасферу, у якой павінна праходзіць выбарчая кампанія. Што тычыцца метадычных дапаможнікаў, то імі ўжо забяспечаны ўсе. «Мы стварылі добрыя падручнікі, метадычныя рэкамендацыі для ўчастковых, тэрытарыяльных, акруговых выбарчых камісій, а таксама брашуры з нашымі фінансавымі дакументамі. Для Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу падрыхтаваны асобны матэрыял. З гэтым усім можна азнаёміцца на інфармацыйным партале Цэнтральнай выбарчай камісіі. Мне прыемна, што гэта заўважаюць і тыя, хто адносіць сябе да апазіцыі. Сёння я з задавальненнем прачытала пісьмо ад пана Стэфановіча, які падзякаваў Цэнтральнай камісіі за якасны сайт, які дазваляе ўдзельнікам, скажам так, разбірацца ва ўсіх перыпетыях выбарчай кампаніі. Для мяне гэта дарагога каштуе, таму што шэраг нашых палітыкаў часцяком проста бачаць толькі дрэннае, не заўважаючы пазітыўнага», — канстатавала Лідзія Ярмошына.

Акруговыя абласныя выбарчыя камісіі і Мінская гарадская створаны ўпершыню. І, па словах старшыні Цэнтрвыбаркама, будуць адыгрываць вельмі важную ролю. Па сутнасці, яны ў сваіх рэгіёнах падменяць функцыі Цэнтральнай выбарчай камісіі. Раней усе адмовы ў рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты ад ініцыятыўных груп ішлі прама ў Цэнтральную камісію. Цяпер гэта ўсё будзе разглядаць адпаведная тэрытарыяльная камісія, а далей скаргі, прэтэнзіі будуць накіроўвацца ў абласныя суды або Мінскі гарадскі суд.

У адказ на пытанне, каму адкрываць дзверы падчас збору подпісаў за таго ці іншага кандыдата ў дэпутаты, каб не нарвацца на махляра, Лідзія Ярмошына сказала, што ўсё павінна быць пабудавана на даверы і прыстойнасці ініцыятыўных груп. Выбаршчыкі перш за ўсё павінны ведаць, што члены ініцыятыўных груп маюць адпаведнае пасведчанне, праўда, без фатаграфіі. Яно не сапраўднае без прад'яўлення дакумента з фота. Інакш кажучы, яны павінны паказаць свой пашпарт, службовае, пенсійнае пасведчанне, студэнцкі білет, абавязкова — з фатаграфіяй. «Можна таксама запісаць прозвішча таго, хто ў вас быў. Магчыма, у далейшым гэта спатрэбіцца ў выпадку праверак подпісаў, прадстаўленых кандыдатамі, калі вам патэлефануюць», — адзначыла Лідзія Ярмошына.

Старшыня Цэнтрвыбаркама таксама падкрэсліла, што будзе разглядацца пытанне па стварэнні безбар'ернага асяроддзя для асоб, у якіх ёсць праблемы са здароўем, з апорна-рухальным апаратам.

Яна адзначыла, што па стане на 7 ліпеня пададзена 396 заявак на рэгістрацыю ініцыятыўных груп. Пакуль зарэгістравана 256, але гэта не азначае, што астатнім будзе адмоўлена. Проста ўсё яшчэ ў рабоце. Большасць груп зарэгістравана беспартыйнымі грамадзянамі. Тым не менш ёсць і 91 партыец.

Да таго, што ў парламенце, магчыма, будуць медыйныя асобы, як, напрыклад, спявачка Ірына Дарафеева, Лідзія Ярмошына адносіцца станоўча: «Па сутнасці, мы капіруем расійскі вопыт. Ірына — чалавек малады, і пры гэтым сталы. Прычым папулярны. Не трэба ніякага піяру, адмысловых тэхналогій. Думаю, у прынцыпе такія людзі проста ўнатуральна выйгрышным становішчы. Між іншым, галіна культуры ў парламенце была мала прадстаўлена. Таму добра, калі чалавек з сферы культуры будзе дэпутатам».

* * *

Акруговыя выбарчыя камісіі **Мінскай вобласці** зарэгістравалі 31 ініцыятыўную групу па зборы подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асоб, якія прапануюцца для вылучэння кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі шостага склікання. Усяго было пададзена 49 заяў на рэгістрацыю. Адной ініцыятыўнай групе адмоўлена ў рэгістрацыі ў сувязі з парушэннем дзеючага выбарчага заканадаўства. Пра гэта 6 ліпеня паведаміў **старшыня Мінскай абласной выбарчай камісіі Вадзім БАНДАРЭНКА.**

Подпісы прадстаўнікі ініцыятыўных груп у падтрымку кандыдатаў у дэпутаты збіраюць шляхам арганізацыі пікетаў або падворнага абходу грамадзян. На Міншчыне рашэннем раённых і гарадскіх улад ўжо вызначаны месцы, дзе забараняюцца пікеты. Гэта чыгуначныя вакзалы, аўтавакзалы, тэрыторыі прыблізна ў радыусе 50 метраў ад будынкаў органаў выканаўчай улады, судоў, пракуратуры, воінскіх частак. З дакладнай інфармацыяй на гэты конт можна азнаёміцца на афіцыйных сайтах гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў.

Вадзім Бандарэнка таксама паведаміў, што акруговыя выбарчыя камісіі Мінскай вобласці акрэдытавалі 27 нацыянальных назіральнікаў за ходам выбарчай кампаніі ў Палату прадстаўнікоў. Найбольшую актыўнасць па вылучэнні назіральнікаў праявілі Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь», Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, Беларускі Хельсінкскі камітэт.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■

# ЗОНА ДЗЕЛАВОЙ АКТЫЎНАСЦІ

**— Былых кіраўнікоў не бывае, ваш досвед можа быць і сёння вельмі запатрабаваны — падкрэсліў старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК, калі сустракаўся з ветэранамі, якія маюць вялікі вопыт работы на розных пасадах.**

**Цёплая сяброўская сустрэча адбылася ў Хойніках, дзе Уладзімір Андрэевіч як удзельнік пятага Усебеларускага народнага сходу падзяліўся сваімі развагаміннямі наконт перспектыў развіцця вобласці.**

Паколькі лёс многіх прысутных быў цесна звязаны з сельскагаспадарчымі раёнамі, гутарка пачалася пра сяло і яго праблемы. Між тым, падкрэсліў кіраўнік Гомельшчыны, цяпер у вобласці практычна не засталося трухлявых хат і закінутых вёсак:

— Сёння ўвогуле мяняюцца ў людзей адносіны да зямлі. Наша задача — мяняць не толькі тэхналогіі, але і стаўленне да працы. Бо апошнім часам у сельскай гаспадарцы кардынальна змяніліся і вытворчая база, і ўмовы працы, і нават клімат — у нас на 40% стала менш выпадаць ападкаў. Таму сёння патрэбны індывідуальны падыход да кожнага поля. Мы сыходзім ад вырошчвання многіх культур у раслінаводстве. Вырошчваць сёння трэба тое, што эканамічна мэтазгодна. А, напрыклад, тую ж агародніну сёння з поспехам вырошчваюць фермеры, якіх на Гомельшчыне 220.

Губернатар Гомельшчыны нагадаў, што за апошнюю пяцігодку вобласць прырасла на 20 % па ўсіх відах сельгаспрадукцыі. За гэты час пабудавана 57 новых дайных комплексаў. Увага дзяржавы да праблем вёскі станоўча паўплывала на яе развіццё. Дарэчы, так званыя чарнобыльскія раёны сёння практычна нічым не адрозніваюцца ад іншых. Хіба тым, што тут затрымліваецца моладзь і павялічваецца нараджальнасць, — заўважыў Уладзімір Дворнік.

— Неабходна разумець: чым лепш будзе працаваць эканоміка, тым больш сродкаў можна будзе ўкласці ў сацыяльную сферу, падніемаючы тым самым узровень жыцця нашых людзей. У сувязі з гэтым мясцовыя органы ўлады ўсе намаганні накіроўваюць на захаванне і развіццё прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, стварэнне новых працоўных месцаў у рэгіёне. Для павышэння дабрабыту нашых людзей варта засярodзіць увагу на рабоце рэальнага сектара эканомікі. І для гэтага ў нас ёсць усё неабходнае, — адзначыў кіраўнік вобласці.

Успамінаючы тэмы, якія абмяркоўваліся на апошнім Усебеларускім народным сходзе, старшыня аблвыканкама падкрэсліў, што сёння важна развіваць вытворчасць і прыцягваць у вёску бізнес. Ужо цяпер гэтыя раёны атрымалася не проста захаваць, але і ператварыць у зоны дзелавой актыўнасці. У пацярпелых раёнах Гомельскай вобласці дзейнічае больш за дзве тысячы прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнесу, якія пастаянна павялічваюць аб'ёмы. І патэнцыял гэты далёка не вычарпаны.

Напярэдадні старшыня Хойніцкага райвыканкама Аляксандр Ціток азнаёміў гасцей з некаторымі мясцовымі прадпрыемствамі. У прыватнасці, яны былі прыемна ўражаны ўзроўнем мадэрнізацыі на Палескім вытворчым участку ААТ «Мілкавіта».

Уладзімір Дворнік падкрэсліў, што галоўная задача мясцовых органаў улады заключаецца ў павышэнні дабрабыту грамадзян. А дамагчыся поспеху ў гэтай справе можна толькі пры ўмове стабільнай эфектыўнай працы рэальнага сектара, развіцці дзелавой ініцыятывы, узважанай кадравай палітыкі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ З нагоды

# РУХ ПА ПРАВІЛАХ

**Свой 80-гадовы юбілей Дзяржаўтаінспекцыя адзначыла парадам рэтра- і сучаснай аўтатэхнікі, выступленнем матацыклістаў**



Гэта хоць і быў звычайны будны дзень, але людзей на Кастрычніцкай плошчы сталіцы сабралася шмат. Перад вачамі мінакоў з'явіліся матацыклы і аўтамабілі, па якіх можна вывучаць гісторыю беларускай ДАІ! Тут і «Масквічы», «Жыгулі», «Волга» з розных эпох, і, безумоўна, сучасныя «Крайслеры», на якіх сёння працуюць супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі.

Калі ў 2000 годзе **Андрэй ГУРЫНОВІЧ, супрацоўнік спецпадраздзялення «Страла» МУС,** прыйшоў працаваць у ДАІ, такіх рэтра-аўтамабіляў у гаражы ўжо не было. Былі іншыя. Больш магутныя і камфортныя. Але і за той час, пакуль ён працуе ў праваахоўных органах, аўтапарк Дзяржаўтаінспекцыі паспеў значна абнавіцца.

— Тады яшчэ былі УАЗ-2108, якія ў народзе называлі «васьмёркамі», але неўзабаве мы пачалі ездзіць на машынах маркі «Опель», — кажа Андрэй, які на парадзе выконваў ролю вадзіцеля аднаго з рэтрамабіляў. — А зараз мы працуем на сучасных, больш магутных аўтамабілях.

***— Памятаеце, якую самую вялікую хуткасць выціскалі на службовым аўто?***

— Звычайна на спідометр не глядзіш. Аднак максімальная хуткасць на «Опелі Вектра» складала 260 км/г. Гэта было чатыры гады таму, калі праследавалі «Мерседэс». Скончылася ўсё паспяхова. Машыну спынілі. За рулём аказаўся нецвярозы кіроўца.

Акрамя аўтавыставы госці пабачылі экспазіцыю формы супрацоўнікаў ДАІ розных перыядаў, выставу дзіцячай творчасці на тэму бяспекі дарожнага руху. А завяршылася свята канцэртам з удзелам беларускіх выканаўцаў. Кіраўніцтва Дзяржаўтаінспекцыі вырашыла адзначыць юбілейную дату з размахам і запрасіла 600 ветэранаў, дзейных супрацоўнікаў. Самаму пажылому ўдзельніку мерапрыемстваў — 91 год.



Фота Надзеі БУЖАН.

**Дзмітрый КАРЗЮК, начальнік упраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС,** у размове з журналістамі адзначыў, што рэвалюцыйных зменаў у структуры дарожнай міліцыі не будзе, але ён паставіў чатыры задачы для развіцця ДАІ.

— Першая — гэта прафесійная падрыхтоўка: ад вядзення адміністрацыйнага працэсу да контраварыйнай падрыхтоўкі, — кажа начальнік Дзяржаўтаінспекцыі. — Наступная — стварэнне камфортных умоў, каб кіроўца мог ехаць і не парушаць правілы дарожнага руху. Трэцяя задача — арганізацыя правільнага тэхнічнага кантролю за выкананнем ПДР. Сёння адна камера можа замяніць многіх інспектараў. Але ўсе сродкі кантролю павінны правільна ўжывацца. А сэнс чацвёртай задачы — у стварэнні пазітыўнага іміджу супрацоўніка Дзяржаўтаінспекцыі.

У сваю чаргу **Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў,** падчас канцэрта заўважыў, што асноўнай задачай ДАІ з'яўляецца ўстанаўленне партнёрскіх адносін удзельнікаў дарожнага руху і аўтаінспектараў. Сёння ў Беларусі налічваецца больш за 4 мільёны транспартных сродкаў, аднак Дзяржаўтаінспекцыі ўдаецца стрымліваць аварыйнасць на дарогах.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
*taras@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ХВАЛЯ МОЦНЫХ ДАЖДЖОЎ

**Істотна пацяплее толькі на наступным тыдні**

**Сёння на тэрыторыі Беларусі ў асноўным будзе гаспадарыць халадноватая няўстойлівая паветраная маса, а па поўначы краіны адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту і будзе воблачна з праясненнямі. Пераважна па паўночнай палове Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы, паведамляюць спецыялісты Белгідраметэацэнтра.**

Вецер заходні ўмераны, удзень парывісты. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе дасягаць плюс 18—23 градусы. У суботу да нас завітае актыўная сістэма франтоў, якія змяшчаюцца з тэрыторыі Польшчы. Таму на большай частцы краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, удзень у асобных раёнах моцныя. Месцамі прагрымяць навальніцы. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе 10—15 цяпла, а максімальная ўдзень — плюс 16—23 градусы. Потым атмасферныя франты пачнуць паступова адыходзіць на суседнія раёны Расіі, а на захад краіны распаўсюдзіцца вобласць павышанага атмасфернага ціску. Таму ўначы на нядзелю на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, уначы ў асобных раёнах чакаюцца моцныя дажджы. Месцамі магчымы навальніцы. Уначы чакаецца 10—15 цяпла, а ўдзень — ад плюс 18 да плюс 25 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Мінус чатыры нулі

# ЛІК ПАЧЫНАЕЦЦА З КАПЕЙКІ

**З банкаматамі і інфакіёскамі трэба «размаўляць» на мове новых грошай**

**Намеснік прэм'ер-міністра Наталля Качанава лічыць, што праведзеная дэнамінацыя спросціць разлікі ў паўсядзённым жыцці як звычайных жыхароў краіны, так і тых, хто непасрэдна ў працы сутыкаецца з лічбамі. На яе погляд, ніякага павышанага ажыятажу ў краіне няма абсалютна. «Не ўзнікае цяжкасцяў і пры разліках у гандлёвых аб'ектах. Тут старыя і новыя цэннікі былі выстаўлены загадзя», — падкрэсліла яна нядаўна, каментуючы першыя вынікі дэнамінацыі.**

Гэта сапраўды так, але на першым этапе мы павінны індывідуальна перайсці на новы фармат грошай і навучыцца беспраблемна карыстацца паслугамі банкаўскіх прылад самаабслугоўвання. А тут сёння ёсць нюансы...

Нагадаю, што да 1 ліпеня абазначэнне нашай валюты пры электронных разліках значылася як BYR, а пасля дэнамінацыі стала BYN. Гэта, калі ў BYR мы раней плацілі, напрыклад, 61400 рублёў, то ў BYN будзе 6,14 рубля. Так, цяпер усе банкаматы, інфакіёскі і банкаўскія тэрміналы дзейнічаюць у сістэме новых грошай, дзе побач з рублямі прысутнічаюць ужо і капейкі. Тут пакуль усё зразумела.

Усе мы хутка атрымаем (ці ўжо атрымалі) заробленыя за чэрвень грошы на пластыкавыя карткі і, магчыма, пойдзем іх часткова здымаць. Пасля таго як картка трапляе ў банкамат, яго праграма прапануе нам зняць на выбар 5, 10, 20 ці 50 рублёў або іншую суму. Калі вам хопіць паказаных на экране грошай, то вы ціскаеце на выбраны намінал і атрымліваеце неабходную купюру. Крыху іншы алгарытм карыстальніка «пластыкам» будзе пасля выбару опцыі «іншая сума». Тут вам прапануецца самастойна набраць неабходную суму ў асобным пустым радку. Праўда, цяпер гэты радок не зусім пусты, бо там узнікае стартавая лічба 0,00. Калі цяпер мы проста націснем на лічбу 5, то на экране з'явіцца 0,05, што адпавядае 5 новым капейкам. Такім чынам, для таго каб кліент зняў з банкамата, напрыклад, 500 рублёў, яму трэба на клавіятуры набраць лічбу 5 і плюс чатыры нулі. У гэтым выпадку 50 000 капеек машына аўтаматычна пераводзіць ў рублі, калі на экране банкамата будзе 500,00.

Такі ж алгарытм набору нам неабходна будзе выконваць пры аплаце «пластыкам» паслуг мабільных аператараў, а крыху пазней і камунальных паслуг у інфакіёсках. Напрыклад, мой аператар Velcom прадугледжвае мінімальны плацеж у памеры 0,15 новымі, ці 1500 рублёў старымі, а наконт максімальнай сумы там інфармацыя адсутнічала.

Навошта я вам гэта падрабязна так тлумачу? Справа ў тым, што ў першыя дні пасля дэнамінацыі банкаматамі і інфакіёскамі для выканання больш складаных аперацый карысталіся выключна сапраўды смелыя кліенты. І нават яны часам не адразу разумелі, што трэба рабіць. А праз адзін-два тыдні банкаўскімі прыладамі пачне карыстацца масавы спажывец. Яму трэба загадзя падрыхтавацца, каб разбірацца з гэтымі нулямі-капейкамі і не заблытацца.

Але, галоўнае, я бы параіў ужо цяпер дакладна сабе ўсвядоміць максімальную суму грошай, якую вы збіраецеся пакласці на тэлефон. У свой час мая дачка прасіла мяне пакласці на яе тэлефон 50, тады яна мела на ўвазе 50 тысяч. Дзіўна чуў ад знаёмага, што той па аналогіі паклаў на свой смартфон 70 рублёў новымі, а гэта было на парадак больш ад запланаванага (700 тысяч на старыя грошы!).

## Жыроўкі — у BYN і BYR

Кіраўніцтва жыллёва-камунальнай гаспадаркі параіла падначаленым арганізацыям пасля дэнамінацыі друкаваць рахункі за камунальныя паслугі з указаннем новых і старых цэн, паведамляе прэс-служба ведамства.

Плануецца, што ў жыроўках, якія прыйдуць у ліпені (за чэрвень), кошт паслуг будзе паказаны ў новых цэнах. А побач будуць публікавацца цэны ў старых грашах у якасці даведачнай інфармацыі.

Падобны фармат інфармацыі ў жыроўках захаваецца да канца года, паколькі, паводле ўказа Прэзідэнта аб дэнамінацыі, у перыяд паралельнага хаджэння старых і новых грошай (з 1 ліпеня па 31 снежня) усе, хто прадае тавары, аказвае паслугі або выконвае работы, павінны паказваць цэны ў двух варыянтах — з нулямі і без іх.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Напярэдадні

# КОД СЛАВЯНСКАЙ КУЛЬТУРЫ — ДУХОЎНАСЦЬ

**У Цэнтры культуры «Віцебск» у дзень адкрыцця XXV Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» пройдзе «круглы стол» па тэме «Культура і мастацтва як крыніца развіцця духоўна-маральных каштоўнасцяў. Роля СМІ ў фарміраванні агульнай культурнай прасторы славянскіх народаў».**

Да ўдзелу ў размове, якая пачнецца выступленнем міністра інфармацыі Беларусі Ліліі Ананіч, запрошаны вядомыя ў краіне і за яе межамі медыйныя персоны — міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў, старшыня Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька, кампазітар Алег Елісеенкаў, спявак Пётр Ялфімаў, дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Алег Рыжкоў, украінскі музычны прадзюсар Уладзіслаў Багінскі, дырэктар міжнароднага цэнтра культурных сувязяў «Ізраіль — Беларусь» Аркадзь Крумер, дырэктар фонду казахстанскага фестывалю «Базтаргай» Карлыгаш Абдыкарымава, протаіерэй Фёдар Поўны, паэт-песеннік Іван Юркін, журналістка Людміла Крушынская, народны артыст Беларусі Анатоль Ярмоленка, мастацкі кіраўнік тэатра «Лялька» Віктар Клімчук і шмат хто яшчэ з гасцей і ўдзельнікаў «Славянскага базару ў Віцебску».

**Сяргей ШЫЧКО.**

■ У цэнтры ўвагі

# НЕ ЗА КОШТ САЦЫЯЛЬНЫХ ГАРАНТЫЙ...

**Стварэнне новых працоўных месцаў, заработную плату абмяркоўвалі ўрад, прафсаюзы і наймальнікі**

**Учора ў Мінску прайшло пасяджэнне Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях. У ім узялі ўдзел прадстаўнікі ўрада, прафсаюзаў і рэспубліканскіх аб'яднанняў наймальнікаў. У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў пасяджэння была выпрацоўка ўзгодненай пазіцыі ўсіх трох бакоў па рэалізацыі сацыяльна-эканамічнай палітыкі.**

**Намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір СЯМАШКА** адзначыў станоўчыя тэндэнцыі ў эканоміцы краіны за першае паўгоддзе гэтага года, якія праяўляюцца ў першую чаргу ў тым, што ўдалося стрымаць інфляцыю, і выказаў упэўненасць, што напрыканцы года інфляцыя не перавысіць 12% — гэта прагнозных лічбы на 2016 год. Уладзімір Сямашка нагадаў, што ў гэтай пяцігодцы стаіць задача кожны год ствараць па 50 тысяч працоўных месцаў. Паводле слоў віцэ-прэм'ера, справаздачы, якія паступілі з міністэрстваў і ведамстваў, гавораць аб тым, што гэтыя паказчыкі вытрымліваюцца.

Як паведаміла **намеснік міністра эканомікі Ірына КАСЦЕВІЧ,** прымаюцца актыўныя меры па працаўладкаванні людзей на створаныя працоўныя месцы. За кошт стварэння новых прадпрыемстваў у першым квартале сёлета было працаўладкавана больш за 9 тысяч чалавек, за кошт расшырэння ўжо дзеючых вытворчасцяў — больш за 6 тысяч чалавек. Работа па стварэнні працоўных месцаў знаходзіцца на асаблівым кантролі ўрада. Пры гэтым, як адзначыла намеснік міністра эканомікі, масавага вызвалення рабочай сілы не было допушчана. Больш за тое, у апошнія месяцы, па словах Ірыны Касцевіч, назіраецца павелічэнне попыту на рабочую сілу. У цэлым на сённяшні дзень, па звестках ведамства, на адну вакансію прэтэндуюць 1,5 беспрацоўных.

Быў таксама абмеркаваны праблемны пытанні ў рабоце індывідуальных прадпрымальнікаў. Іх колькасць, па звестках на 1 красавіка 2016 года, скарацілася больш чым на 9 тысяч чалавек у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, што складае 3,9%.

Разам з тым апошнім часам назіраецца павелічэнне ліку нанятых індывідуальнымі прадпрымальнікамі работнікаў — іх колькасць у параўнанні з 1 красавіка мінулага года вырасла на 6 тысяч. Гэта значыць, па словах намесніка міністра эканомікі, некаторыя ІП, якія не справіліся з новымі патрабаваннямі, перайшлі ў наёмных работнікі.

Міністэрства эканомікі цяпер працуе над тым, каб змяніць гэту негатыўную тэндэнцыю і нарасціць малое і сярэдняе прадпрымальніцтва. Было створана некалькі працоўных груп па рашэнні праблемных пытанняў, што тычацца індывідуальных прадпрымальнікаў, у выніку работы якіх самыя вострыя праблемы былі зняты. Цяпер рыхтуецца праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця да 2020 года, у якой прапісаны сур'ёзныя мерапрыемствы для стварэння спрыяльнага дзелавога клімату.

Таксама Мінэканомікі дапрацоўвае праект пастановы Нацыянальнага банка і Саўміна па ўнясенні змяненняў па выкарыстанні плацежных тэрміналаў. Згодна з пастановай, можна будзе выкарыстоўваць адзін плацежны тэрмінал некалькімі ІП, а таксама адзін тэрмінал адным ІП, калі ў яго некалькі гандлёвых кропак. Яшчэ адзін момант: плацежны тэрмінал неабходна будзе выкарыстоўваць, толькі калі сярэднямесячная выручка ІП за квартал перавышае 300 базавых велічынь.

Абмяркоўваліся і пытанні сацыяльнай абароны насельніцтва ва ўмовах няпростай эканамічнай сітуацыі. Гэта датычыцца захавання сацыяльных гарантый для працоўных калектываў, а таксама ўзроўню заработнай платы, павелічэння дапамогі па беспрацоўі і інш.

У прыватнасці, як заявіла прадстаўнік Міністэрства эканомікі, у цяперашні час вядзецца работа над праектам указа аб дыферэнцаваным павышэнні дапамогі па беспрацоўі.

Прафсаюзы выступілі за такія новаўвядзенні ў заканадаўстве як страхаванне ад беспрацоўя і ад банкруцтва наймальніка. Так, пры банкруцтве прадпрыемстваў людзі часта застаюцца без заробку. Але работнікі не павінны заставацца без кампенсацыі і страчваць заробленыя грошы. Трэба ствараць гарантыйныя фонды для выплаты зарплаты ў такіх выпадках, лічыць **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА.**

Акрамя таго, лідар прафсаюзаў адзначае: «Пастанова Савета Міністраў ад 31 ліпеня 2014 года №744 «Аб аплаце працы работнікаў» дакладна вызначае, што зарплата павінна расці толькі з ростам прадукцыйнасці працы. Мы з гэтым згодныя: зарплату трэба зарабіць. Але павінна таксама выконвацца формула: не расце зарплата — не растуць і цэны».

— Кожнае прадпрыемства глядзіць, як і за кошт чаго знізіць выдаткі, але гэта не павінна адбывацца за кошт сацыяльных гарантый, — упэўнены старшыня Федэрацыі прафсаюзаў. — Гэта непрымальная формула. Маецца калектыўны дагавор, у якім ёсць дакладныя гарантыі, якія прафсаюзы вызначылі з наймальнікамі. Сёння штучна іх зніжаць немагчыма.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

# Сем дзён, каб вызначыцца з прафесіяй

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У вышэйшых навучальных установах сёлета адкрываюцца шэсць новых спецыяльнасцяў: «Судовыя крыміналістычныя экспертызы» — у Акадэміі МУС, «Вытворчасць вырабаў на аснове трохмерных тэхналогій» — у БДТУ, кірунак «Шахматы» на спецыяльнасці «Спартыўна-педагагічная дзейнасць» — у Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры. А ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце будзе весціся набор адразу па чатырох новых спецыяльнасцях: «Гісторыя і сусветная мастацкая культура», «Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа» (абедзве на гістарычным факультэце), «Сацыяльная і псіхолага-педагагічная дапамога» на факультэце сацыяльна-педагагічных тэхналогій і «Музычнае мастацтва і сусветная мастацкая культура» — на факультэце эстэтычнай адукацыі.




## БЕЗ ЭКЗАМЕНАЎ

Дарэчы, Міністэрства адукацыі пашырыла ў гэтым годзе пералік педагагічных спецыяльнасцяў у ВНУ, пры паступленні на якія асобныя катэгорыі абітурыентаў залічваюцца без уступных выпрабаванняў.

Нагадаем, што для таго, каб прыцягнуць добра падрыхтаваных абітурыентаў на педспецыяльнасці, два гады таму было прынята рашэнне залічваць туды медалістаў і выпускнікоў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў з дыпломам з адзнакай без уступных экзаменаў — пры ўмове наяўнасці ў апошніх рэкамендацыі педагагічнага савета сваёй навучальнай установы. Тое ж тычыцца і пераможцаў трэцяга абласнога тура прадметных школьных алімпіяд. Уладальнікам дыпломаў I, II і III ступеняў трэцяга (абласнога і Мінскага гарадскога) этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, праведзеных Міністэрствам адукацыі ў бягучым навучальным годзе, дадзена права паступаць без уступных іспытаў на педагагічныя спецыяльнасці, для якіх гэты прадмет вызначаны прадметам першага профільнага экзамену.

У гэты пералік увайшлі наступныя спецыяльнасці: «Дашкольная адукацыя», «Пачатковая адукацыя», «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны», «Біялогія і геаграфія», «Матэматыка і інфарматыка», «Біялогія» (навукова-педагагічная дзейнасць), «Хімія» (навукова-педагагічная дзейнасць), «Геаграфія» (навукова-педагагічная дзейнасць), «Матэматыка» (навукова-педагагічная дзейнасць), «Фізіка» (навукова-педагагічная дзейнасць), «Фізіка і інфарматыка», «Фізіка і тэхнічная творчасць», «Беларуская мова і літаратура», «Руская мова і літаратура», «Тэхнічная праца і прадпрымальніцтва», «Абслуговая праца і прадпрымальніцтва», «Абслуговая праца і выяўленчае мастацтва», «Лагапедыя», «Сурдапедагогіка», «Тыфлапедагогіка», «Алігафрэнапедагогіка», «Сацыяльная педагогіка» — усяго 22.

Цяпер пералік папоўнілі яшчэ тры спецыяльнасці: «Прафесійнае навучанне» (па кірунках), «Беларуская філалогія» (па кірунках) і «Руская філалогія» (па кірунках). Новыя спецыяльнасці, што адкрываюцца ў БДПУ сёлета, пакуль што ў пералік не ўвайшлі.

Да асаблівасцяў прыёму 2016 года можна аднесці і адкрыццё ў Інстытуце пагранічных войскаў прыёму асоб жаночага полу па спецыяльнасці «Кіраванне падраздзяленнямі пагранічнага кантролю» (для іх выдзелена 20 месцаў).

Пасля шматгадовага перапынку падрыхтоўка для асоб жаночага полу аднаўлена і ў Ваеннай акадэміі па спецыяльнасцях «Практычная псіхалогія ў ваеннай справе» (2 месцы), «Эксплуатацыя аўтаматызаваных сістэм інфармацыі» (5 месцаў), «Тэхнічная эксплуатацыя электрасістэм і пілатажна-навігацыйных комплексаў лятальных апаратаў» (2 месцы) і «Авіяцыйныя радыёэлектронныя сістэмы» (3 месцы).

## НЕ ПАМЫЛІЦЦА З ПАДЛІКАМІ

Як сёлета ўкамплектуюцца вышэйшыя навучальныя ўстановы, як укамплектуюцца педагагічныя і інжынерна-тэхнічныя спецыяльнасці, як будуць запаўняцца платныя месцы, даволі цяжка спрагназаваць. Колькасць удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання сёлета зменшылася нязначна. Затое колькасць уладальнікаў максімальнага выніку ўзрасла (у гэтым годзе будзе выдадзена 330 стабальных сертыфікатаў), як павялічылася і колькасць абітурыентаў, якія набралі больш за 50 балаў. А гэта азначае, што на традыцыйна папулярныя у моладзі спецыяльнасцях прахадныя балы акажуцца сёлета вельмі высокімі. Ды і на іншых спецыяльнасцях прахадныя балы таксама падрастуць.

Раздумваць і падлічваць свае шанцы на паступленне абітурыенты змогуць да 14 ліпеня. Інфармацыя аб ходзе прыёму дакументаў будзе абнаўляцца прыёмнымі камісіямі штодня кожныя тры гадзіны: у 9.00, 12.00, 15.00 і 18.00 гадзін. Але ў апошні дзень прыёму дакументаў інфармаванне абітурыентаў спыніцца а 15 гадзіне! І галоўнае тут — не памыліцца з падлікамі, спрабуючы пралічыць свае шанцы на паступленне. Лепш усё ж такі не адкладваць падачу дакументаў на апошні дзень: калі такіх жа разумнікаў акажацца шмат, конкурсная сітуацыя можа рэзка змяніцца ўжо пасля закрыцця прыёмнай камісіі, і абітурыент мае ўсе шанцы застацца за бортам.

## ГРАФІК ПРЫЁМНЫХ КАМІСІЙ

Тэрміны залічэння на «бюджэт» наступныя:

**па 22 ліпеня** — на дзённую і завочную формы атрымання адукацыі ў ВНУ сілавых ведамстваў;

**па 28 ліпеня** — на дзённую і завочную формы атрымання адукацыі ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў;

**па 24 ліпеня** — на вочную і завочную формы атрымання адукацыі ў іншых дзяржаўных установах вышэйшай адукацыі (акрамя завочнай формы атрымання адукацыі ў сельскагаспадарчых ВНУ);

**па 20 снежня** — на завочную форму атрымання адукацыі ва ўстановах вышэйшай адукацыі сельскагаспадарчага профілю.

**Да асаблівасцяў прыёму 2016 года можна аднесці і адкрыццё ў Інстытуце пагранічных войскаў прыёму асоб жаночага полу па спецыяльнасці «Кіраванне падраздзяленнямі пагранічнага кантролю» (для іх выдзелена 20 месцаў).**

Прыём дакументаў на вакантныя бюджэтныя месцы (дадатковы набор) у большасці ВНУ будзе весціся тры дні: з 26 па 28 ліпеня, у творчых ВНУ — з 29 па 30 ліпеня, у ВНУ сілавых ведамстваў — з 24 па 26 ліпеня. Залічэнне ў кола студэнтаў пройдзе не пазней за 31 ліпеня. У ВНУ сілавых ведамстваў — па 27 ліпеня.

А вось тэрміны залічэння на платнай аснове былі павялічаны на адзін дзень, каб ВНУ маглі правесці больш якасную працу па заключэнні дагавораў на навучанне. Падаць дакументы тым, хто не прайшоў на бюджэтную форму навучання, у ВНУ сілавых ведамстваў трэба не пазней 28 ліпеня, у творчых ВНУ — да 30 ліпеня і ў іншых ВНУ — да 1 жніўня. Залічэнне ў ВНУ сілавых ведамстваў — да 29 ліпеня, у творчых ВНУ — па 31 ліпеня і ва ўсіх іншых ВНУ — па 4 жніўня.

**Любыя пытанні, што датычацца ўступнай кампаніі, выпускнікі і іх бацькі могуць задаць па «гарачай лініі» Міністэрства адукацыі (223-43-12) ці патэлефанаваўшы ў штаб Дзяржаўнай камісіі па кантролю за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў (327-66-80).**

Надзея **НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# «УНІВЕРСІТЭТ ДАЕ СІСТЭМНАСЦЬ»

## РЭКТАР МІТСО — ПРА ВАЖНАСЦЬ ТЭОРЫІ І ПОПЫТ НА СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

**«У нас зашмат юрыстаў і эканамістаў? Наадварот, спецыялістаў не хапае», — упэўнены рэктар Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО» Станіслаў КНЯЗЕЎ. Якой павінна быць сучасная вышэйшая адукацыя? Ці паспявае яна рэагаваць на змены на біржы працы? Чаму балы за ЦТ не адзінае, што павінна ўплываць на выбар прафесіі? Пра гэта рэктар прафсаюзнай ВНУ расказаў у інтэрв'ю «Звяздзе».**



***— Летась універсітэт адзначыў юбілей — 85 гадоў. Што сёння ўяўляе сабой прафсаюзная адукацыя?***

— Яна дае тэхналогіі рашэння розных дзяржаўных задач. Акрамя класічнага профільнага ўніверсітэта, у нас ёсць яшчэ і Рэспубліканскі вучэбна-метадычны цэнтр прафсаюзаў, які ахоплівае ўсю краіну (яго аддзелы знаходзяцца ў кожнай вобласці). Такім чынам мы наладзілі сістэмнае навучанне прафсаюзнага актыву па ўсёй краіне. Бо для таго, каб людзі эфектыўна працавалі, ім патрэбны перш за ўсё веды.

Цяпер складаная сітуацыя ў многіх працоўных калектывах, і мы ўзброіваем прафсаюзных кадры ўменнем даходліва расказаць людзям аб тым, што крызіс не так страшны, як пра яго гавораць. Крызіс (у перакладзе з грэчаскага) — гэта выхадны пункт і пачатак шляху. Ён сведчыць, што папярэдняя мадэль развіцця састарэла. Гэта проста абазначэнне таго, што ў нашым жыцціназбіралася шмат навізны, мы пераходзім на новы этап развіцця. Трэба прывыкаць да тых рэалій, якія сёння ёсць.

***— А наколькі адукацыя паспявае мяняцца разам з інавацыямі і ладам жыцця?***

— Трэба, каб паспявала. Універсітэт не можа паказаць, што будзе заўтра. Але мы павінны хаця б раскрыць тэндэнцыі развіцця і падказаць чалавеку, да чаго ён мусіць быць гатовы. Чаму мы кажам пра важнасць тэарэтычнай падрыхтоўкі? Калі ты маеш добрую базу, значыць, самастойна можаш ўжыцца ў тыя змены, якія адбываюцца ў вытворчасці. Практыка ж дапамагае працаваць у сённяшніх умовах. Гэтаму складніку мы таксама надаём увагу. Нашы студэнты праходзяць практыку ў Міністэрстве юстыцыі, судах, адміністрацыях раёнаў, буйных адвакацкіх і юрыдычных бюро, банках, прамысловых прадпрыемствах.

**Кожная сям'я павінна мець уласнага юрыста. Нашы людзі не ведаюць, як сябе абараніць, і невялікія наборы адвакацкіх асацыяцый не здольны забяспечыць сёння належную прававую падтрымку.**

***— Ваш універсітэт ладзіць кантакт са школамі, праводзіць семінары для педагогаў. Чаму вам важна гэта супрацоўніцтва?***

— Сёння ёсць праблема з падрыхтоўкай матэматыкаў і настаўнікаў, якія ўмеюць гэту дысцыпліну выкладаць. Некалі існавалі фізіка-матэматычныя школы. Цяпер гэта работа неяк замерла. Кожны год, калі абітурыенты прыходзяць здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне, мы адчуваем, якія ў іх слабыя веды па матэматыцы. Мы не проста гаворым аб праблеме, а рэальна спрабуем дапамагчы яе вырашыць. Матэматычны талент праяўляецца ў раннім узросце, таму мы працуем, пачынаючы з чацвёртага класа. Дапамагаем школам выяўляць у дзецях гэтыя здольнасці. Дырэктары школ, якія ўдзельнічалі ў эксперыменце, былі вымушаны прызнаць, што ўніверсітэцкія выкладчыкі даюць веды лепш. Пра гэта казалі і самі навучэнцы.

***— Дарэчы пра абітурыентаў. Цяпер ідзе ўступная кампанія. Многія выбіраюць месца навучання на падставе балаў, атрыманых за ЦТ. А на што яшчэ варта было б звяртаць увагу пры выбары ВНУ?***

— У многіх прафесіях, апроч ведаў, патрэбны яшчэ і асабістыя якасці. Таму кожнаму абітурыенту варта задумацца, да чаго ён мае схільнасці. Вельмі часта спецыяльнасць выбіраюць па прыкладзе бацькоў, суседзяў, зыходзячы з фільмаў ці кніг. Але лепш пратэсціравацца сябе. Кожны чалавек таленавіты, проста неабходна знайсці гэтыя таленты. Юрыстамі, напрыклад, не ўсе могуць стаць. Тут і пэўны педантызм патрэбен, скрупулёзнасць, каб вывучыць масу дакументаў і знайсці ў іх памылкі ці адхіленні, і філасофская схільнасць розуму, каб бачыць прычынна-выніковую сувязь нейкіх падзей.

***— Сёння кажуць пра перанасычанасць рынка юрыстамі і эканамістамі. Чаму, нягледзячы на гэта, у моладзі такія спецыяльнасці па-ранейшаму карыстаюцца папулярнасцю?***

— Камусьці сапраўды падабаецца прафесія. Некага прыцягвае «лёгкасць»: маўляў, гэта ж не на інжынера адвучыцца. Хоць часцяком гэтыя спецыяльнасці бывае куды складаней засвоіць. Цяпер, дарэчы, ёсць запатрабаванасць у сумяшчальных прафесіях: эканамісты дадаткова атрымліваюць дыпломы юрыстаў, а юрысты — эканамістаў. Гэта лагічна, бо любыя эканамічныя адносіны ўключаюць нарматыўна-прававы бок.

**Універсітэт не можа паказаць, што будзе заўтра. Але мы павінны хаця б раскрыць тэндэнцыі развіцця і падказаць чалавеку, да чаго ён мусіць быць гатовы.**

Так, папулярная думка, што на біржы зашмат юрыстаў і эканамістаў. Я адразу скажу: у нас не перавытворчасць спецыялістаў, а неразвітасць грамадскіх адносін. Кожная сям'я павінна мець уласнага юрыста. Нашы людзі не ведаюць, як сябе абараніць, і невялікія наборы адвакацкіх асацыяцый не здольны забяспечыць сёння належную прававую падтрымку. Юрысты павінны суправаджаць дзейнасць любой установы ці прадпрыемства. І для гэтага патрэбен не работнік на палову стаўкі, а цэлы штат спецыялістаў. На Захадзе ў вялікіх фірмах працуюць юрыдычныя ўпраўленні, куды ўваходзяць дзясяткі людзей. Там і кантракты складаюць не на пару старонак, а на дзвесце, дзе кожная пазіцыя прапісана. І ўсё гэта юрысты прапрацоўваюць.

Такая ж сітуацыя з эканамістамі. Стан нашых прадпрыемстваў сёння такі, што там патрэбен цэлы атрад добрых спецыялістаў. Мы цяпер для аднаго з заводаў рыхтуем бізнес-план, які павінен рабіць не ўніверсітэт, а само прадпрыемства. Але што маем? У бухгалтэрыі трымаюць аднаго-двух эканамістаў, якія проста рыхтуюць зводкі, — ні прапаноў ніякіх, ні распрацовак.

***— На вашу думку, што павінен даваць сёння ўніверсітэт? Наўрад ці проста інфармацыю: яе і ў сеціве знайсці можна...***

— Адрозненне ўніверсітэцкай адукацыі ад самаадукацыі — сістэмнасць. Важна бачыць сувязь паміж ведамі. Сістэма дазваляе чалавеку ўпэўнена дзейнічаць у той ці іншай сітуацыі. Працэс адукацыі сусветнага ўзроўню прадугледжвае, што выкладчык павінен толькі зацікавіць прадметам і скласці праграму паслядоўнага навучання. А студэнт мусіць актыўна займацца самастойна па плане, які яму дадзены, шукаць веды ў бібліятэцы, электронных базах дадных. У нас цяпер лекцыйна-семінарскі метад. Мы імкнёмся да дыялогу. Свае вучэбныя матэрыялы ўніверсітэт выстаўляе ў электронным выглядзе. Так бы мовіць загадзя раздаём іх, каб людзі былі гатовы да дыскусіі. Тады ў навучальным працэсе з'яўляецца навуковая навізна.

***— Цяпер у цане высокакваліфікаваныя спецыялісты. Як імі стаць? Хто выйграе ва ўмовах амаль усеагульнай вышэйшай адукацыі?***

— Той, хто пакажае найлепшыя вынікі. Канкурэнцыю ніхто не адмяняў. Да таго ж ва ўсім свеце людзі ведаюць, што яны павінны чатыры ці пяць разоў перавучвацца, пастаянна атрымліваць дадатковыя веды. Напрыклад, у Злучаных Штатах у сістэме перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі занята 60 працэнтаў працаздольнага насельніцтва, у Японіі — 70 працэнтаў, а ў Паўднёвай Карэі — 85. Пастаянна змяняюцца ўмовы працы, таму і прынцып сёння — адукацыя праз усё жыццё. Удасканальвацца трэба пастаянна.

Наталля **ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

Звязда. Наперад у мінулае. Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

# БЯСЦЭННЫЯ СКАРБЫ ПАЛЕССЯ

## Песні, што ратуюць ад суму і дапамагаюць у працы

**Выпраўляючыся ў вандроўку па Палессі, даследчык традыцыйнай культуры беларусаў можа быць упэўнены: з пустымі рукамі ён дакладна не вернецца. Гэты край — бясконцая крыніца песень, казак, тут жывуць таленавітыя людзі, здольныя здзіўляць сваімі неверагоднымі ўменнямі. Шыць, вышываць, вязаць, пячы смачныя пірагі любіць бадай кожная паляшучка, а паляшук — плесці кошыкі, гадаваць пчол, уладкоўваць хатнюю гаспадарку. А яшчэ ўсіх жыхароў Палесся аб'ядноўвае вялікая любоў да традыцыйнай песні і танца.**

**Вось і чарговая вандроўка карэспандэнта «Звязды» разам з камандай праекта «Наперад у мінулае» тэлеканала «Беларусь 3» атрымалася надзвычай цікавай і плённай. Гэтым разам мы скіраваліся ў вёскі Восава, што на Салігоршчыне, і Чэрнічы Жыткавіцкага раёна. З гуртом «Палескія крыніцы» з Восава тэлегледачы ўжо маглі пазнаёміцца ў эфіры 3 ліпеня, таму ўспомнім толькі самыя яркія моманты той вандроўкі. Але сустрэча са «Спасаўкай» з Чэрніч яшчэ наперадзе (эфір праграмы запланаваны на нядзелю 10 ліпеня), таму запрашаю таксама на Жыткавіччыну.**

### На радзіме «Каваля»

— Не, «Каваля» мы спяваць не будзем! — у адзін голас адказваюць спявачкі «Палескіх крыніц» вёскі Восава на маё пытанне пра вядомую песню, некалі запісаную фальклярыстамі менавіта ў гэтай мясцовасці. Сёння гэты спеў — сапраўдны хіт гуртоў кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ, які гучыць на фестывальных пляцоўках Беларусі і замежжа. А спяваць яго для праекта «Наперад у мінулае» жанчыны адмовіліся, бо хацелі прадставіць не проста вядомыя песні, а рэдкія кампазіцыі, якія яшчэ не гучалі ў эфірах гэтай тэлепраграмы. І, думаецца, гэта ў іх лёгка атрымалася.

Фальклорны народны калектыў «Палескія крыніцы» існуе ў Восаве з 1973 года, ён складаецца з прадстаўнікоў розных пакаленняў. Самыя старэйшыя ўдзельніцы спяваюць у гурце з самага пачатку, а «новае пакаленне» жанчын, маладзейшае, далучылася да яго ў 1998 годзе. Жанчыны кажуць, што ведаюць каля 200 песень, некаторыя з іх сапраўды ўнікальныя. І гэта не дзіўна — яны пераняты спявачкамі ад мам, бабуль. У ліку адметных — песні пра каханне «Пара галубоў», «Далёка-далёка дарога»:

*Далёка-далёка дарога,*
*Далёка чужая старана*
*Уехаў мой мілы далёка,*
*А я засталася адна...*

«Палескія крыніцы» — пастаянныя ўдзельнікі многіх беларускіх і замежных фальклорных фэстаў. Гэта «Залатыя ключы», «Фальклорная талака», «Берагіня», колькі гадоў таму жанчыны прадстаўлялі нашу краіну ў польскім Любліне на фестывалі «Песні балот. Традыцыйная музыка Палесся», а таксама прымалі ўдзел у рэгіянальнай кансультатыўнай сустрэчы экспертаў краін СНД і трэнінгу ЮНЕСКА па выкарыстанні Міжнароднай канвенцыі па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

> **Жанчыны кажуць, што ведаюць каля 200 песень, некаторыя з іх сапраўды ўнікальныя.**

Адметна, што ў склад гурта ўваходзяць не толькі жанчыны, але і мужчыны, напрыклад гарманіст-самавук Іван Каваленя. Дапамагае яму ў спевах кіраўнік мясцовага дома культуры Сяргей Каваленя.

Восава багатае і на майстроў. Так, Пётр Ганчар, які не так даўно адзначыў 90-годдзе, ужо шмат гадоў пляце кошыкі з лазы, навучыўся іх рабіць ад бацькі. Майстрыца Ніна Каваленя ўпрыгожвае вышыўкай уласны касцюм, прасціны, навалочкі і дываны на ложак і дапамагае аздабляць сарочкі іншых удзельніц і ўдзельнікаў гурта. Як вы ўжо заўважылі, у Восаве жыве многа Каваленяў. Спадар Сяргей расказаў, што ўсе яны маюць агульныя карані, а «распачаў» вялікі род пан Каваленя, які калісьці жыў у гэтай мясцовасці.

Жыве тут і выдатная майстрыца Надзея Паддубіцкая.

— Колькі сябе памятаю — столькі вышываю, — кажа яна. — Мы дзеці вайны, таму стараліся рабіць любую працу, карысную на вёсцы. Старэйшыя ішлі на ферму, у калгас, а малыя пасвілі гусей, свіней. Такі занятак дазваляў рабіць нешта яшчэ рукамі — вязаць, вышываць. Пасля вайны ўсе ў вёсцы жылі бедна, але наша мама на рукадзелле грошай не шкадавала: дзе ніткі ў краме пабачыць, дзе кавалачак тканіны, а я вышывала. Неяк сама навучылася. Рыхтавала пасаг не толькі для сябе, але і для сясцёр. Яшчэ ў дзяцінстве я заўважыла, што ў нашай вёсцы амаль усе жанчыны хадзілі ў аднолькавых вышытых кашулях і фартушках. Мне стала цікава, хто так хараша іх аздобіў. І мама распавяла, што неяк на Украіне быў вялікі голад, і адтуль жанчыны пайшлі па вёсках, каб пракарміцца. Прапаноўвалі вышыць адзенне, абрусы, прасціны. Пакуль ішла праца, яны жылі ў сем'ях на Палессі. Так і зіму перазімавалі, і ўсю вёску ўпрыгожылі аднолькавымі вышыўкамі. Вельмі ярка глядзелася — нашы жанчыны нават у поле на сенакос хадзілі прыбраныя, як на свята.

...А «Каваля» «Палескія крыніцы» ўсё ж заспявалі: праўда, не на камеру, а проста для душы, як часта бывае на Палессі. Ды і чаму б не заспяваць, калі песня так хараша гучыць:

*Выганяй, маці,*
*каваля з хаты,*
*Бо каваль малады*
*хоча начаваці...*

Мы ж кіруемся далей, у Чэрнічы, што на Жыткавіччыне, дзе чакае знаёмства з адметным калектывам «Спасаўка».

### Чарніцы ці манастыр?

Існуе некалькі версій паходжання назвы вёскі Чэрнічы. Адна сцвярджае, што раней непадалёк ад вёскі дзейнічаў жаночы манастыр, заснаваны ў XII стагоддзі княгіняй Барбарай. І назва паселішча ўтварылася ад слова «чарнец» — манах. А вось мясцовы жыхар Мікалай Свораб кажа, што ў даўнія часы вакол вёскі было многа лясоў, якія давалі багаты ўраджай чарніц, адсюль і назва — Чэрнічы. Пагадзіцеся, абедзве версіі прыгожыя і лагічныя.


Гурт «Спасаўка» з вёскі Чэрнічы.

Першыя паселішчы людзей у гэтых мясцінах датуюцца археолагамі раннім жалезным векам, а самі Чэрнічы вядомыя з XVIII стагоддзя, у той час яны тэрытарыяльна належалі да Мазырскага павета. Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай (1793) вёска апынулася ў складзе Расійскай імперыі. У той час многія сядзібы і лясы, што былі побач, выкупіла ў графа Салагуба і генерала Сялябіна англійская кампанія, якая за тры гады высекла і вывезла шмат лесу. Тады імператар Павел I загадаў кампаніі вярнуць грошы за землі і спыніць знішчэнне лясоў.

Так Чэрнічы з іх багатымі на ягады і грыбы лясамі былі выратаваныя.

### Без песні няма працы

Сёння ў вёсцы існуе адметны гурт «Спасаўка». Ён удзельнік самага першага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня». Тады, больш як 20 гадоў таму, гурт з Чэрнічаў заняў на гэтым фэсце першае месца. У калектыве ёсць жанчыны, якія маюць больш як шэсць дзясяткаў гадоў спеўнага досведу. Больш за тое, усе спявачкі самі шылі і вышывалі сабе касцюмы.

Кіраўнік гурта «Спасаўка» Кацярына Санец распавяла:

— Гэты калектыў існуе з 1962 года, калі я нарадзілася. Яго праца ніколі не спынялася. Кіраўнікі змяняліся, гурт папаўняўся новымі ўдзельнікамі. Мы выконваем старажытныя песні, якія спрадвек спявалі ў нашай мясцовасці. Іх рэдка можна пачуць у іншых мясцінах.

Сёння «Спасаўка» — актыўны ўдзельнік культурнага і грамадскага жыцця сваёй мясцовасці. Спадарыня Кацярына кажа:

— Мы і вяселлі сустракаем, вітаем маладых песнямі. Вельмі любім ездзіць з выступленнямі: выступалі ў Мінску, у нашым раёне і ў суседніх, удзельнічаем у фестывалях, у раённых дажынках, зажынках. Хто нас ні запросіць — на ўсе прапановы пагаджаемся, таму і назву «Спасаўка» можна патлумачыць па-рознаму: ад свята Спас і ад слова «спасаць» — ратаваць.

Старэйшыя ўдзельніцы гурта ўспамінаюць, што ў даўнія часы жанчыны гуртам збіраліся гуляць, усе разам спявалі песню за песняй. Маладзейшыя вучыліся ў старэйшых. Калі нехта прыйдзе з суседняга сяла — вучыць мясцовых сваім песням, а самі вучацца ў жыхароў Чэрнічаў. Так, пераймаючы адзін аднаго, вучыліся новым спевам. Часта спявалі, калі жалі, падчас сенакосу, без песні працы не было. Жанчыны кажуць, што сёння да песні ў вёсцы іншае стаўленне: калі заспяваеш на лавачцы каля хаты, скажуць: ці вяселле едзе, ці нехта п'яны крычыць. Але да «Спасаўкі» ў вёсцы прывыклі: часам ідуць жанчыны з клуба і дарогай дадому ўсе разам спяваюць. На жаль, адзначаюць спявачкі, моладзь не надта імкнецца пераймаць традыцыі і вучыцца народным песням.

На пытанне пра колькасць песень, якія ведаюць спявачкі са «Спасаўкі», яны адказваюць: мо і больш за сто. Часам сядуць спяваць з раніцы — і могуць выконваць іх да вечара, ні разу не паўтарыцца.

У гурце ёсць і мужчына. Сяргей Захаравіч і спявае, і грае на гармоніку. Ён расказвае:

— Спяваць мяне навучыла маці, якая калісьці хадзіла ў калектыў, а іграць на гармоніку навучыўся сам. З дзіцячых гадоў з калектывам хадзіў у клуб і сёння з ім працую. Спяваю часам і дома, калі цяжка на душы. А пасяваеш — і лягчэй становіцца.

І сапраўды, народная песня, нават самая сумная і трагічная, — выдатная нагода і адпачыць, і душу адвесці. Таму давайце іх спяваць разам, захоўваць і берагчы для наступных пакаленняў беларусаў.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
**Фота аўтара.**
*vesialuha@zviazda.by*

## Бацькава навука

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*







Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Яшчэ больш фота на сайце zviazda.by.

## Аўторак, 12 ліпеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.55** Зона Х.
**8.50** Слова Мітрапаліта Паўла на дзень апосталаў Пятра і Паўла.
**9.10, 22.15 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Грачанка».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20 Серыял «Ліст чакання». 1-я серыя.**
**14.25** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Простае жыццё».**
**17.40 Дэтэктыў «Апошняя сустрэча».**
**19.20, 0.15** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Буйным планам.
**0.50** Дзень спорту.
**1.00 Серыял «Дзявочае паляванне».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.25** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**10.35 Дэтэктыў «Падмані мяне 2».**
**11.30, 17.40 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**12.40 Драма «Не адпускай мяне».**
**14.30** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.15 Трылер «Закрытая школа».**
**17.10** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**18.50 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**19.50 Серыял «Кухня».**
**21.10** «Бітва экстрасэнсаў. Вайна тытанаў».
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.15 Серыял «Чужаземка». 1-я серыя.**

### Беларусь 3

**8.00, 13.30, 18.40, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.15, 13.45** «Размовы пра духоўнае».
**8.25** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**8.35, 17.05 «Нестар Бурма». Серыял.**
**10.05, 19.40 «Архіў смерці». Драма.**
**11.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці крытыка, доктара мастацтвазнаўства, прафесара Вольгі Нячай.
**11.35 «Шчаслівага Раства!» Меладрама.**
**13.55** «Час кіно».
**14.05 «Апошні хлеб». Кінааповесць.**
**15.30 «Вецер забыцця». Маст. фільм.**
**18.55, 21.15** «Паляўнічыя на нацыстаў». Дак. фільм. Фільм першы.
**20.40** «Калыханка».
**21.55 «Князь Юрый Даўгарукі». Драма.**

### Беларусь 5

**7.40** PRO спорт. Вынікі.
**8.05** Час футбола.
**8.50** Мастацкая гімнастыка. Кубак свету. Казань.
**14.00, 23.00** Тэніс. Турнір WTA. Бухарэст.
**19.35, 22.50** PRO спорт. Навіны.
**19.45** Спорт-кадр.
**20.15** «Місія — Рыа». Відэачасопіс.
**20.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Другі кваліфікацыйны раўнд. Першы матч. БАТЭ (Беларусь) — СІК (Фінляндыя).

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Гэта Я».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.20** «Адваротны адлік».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Практыка».**
**22.50** «Давай пажэнімся!»
**23.50 Маст. фільм «Чорны манах».**
**1.25** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.40** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Наша справа».
**14.05 Драма «Гадзіннік».**
**16.05** «Ведай нашых!»
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**21.55** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.20** «Аўтапанарама».
**0.30 «Меч». Серыял.**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Рэальнае ўсынаўленне».
**9.30 Серыял «Марскі патруль».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 19.20 Серыял «Метад Фрэйда».**
**16.20, 3.10** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**16.50, 3.40** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20 Серыял «Невідзімкі».**
**22.00 Маст. фільм «Сцерва для чэмпіёна».**
**23.50** Ток-шоу «Слова за слова».
**0.45 Маст. фільм «Вясельны пярэпалах».**
**2.45** Дак. серыял «Іншы свет».
**4.05 Маст. фільм «У пошуках радасці».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Дуэль разведак. Расія — Германія».
**12.20** «Асуджаныя. Наша Грамадзянская вайна. Маркаў-Раскольнікаў».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Тайны следства».**
**19.10, 20.50 Серыял «Прыгожае жыццё».**
**21.55, 23.10 Серыял «Сястра мая, Любоў».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.20, 22.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**14.15 Серыял «Ціхае паляванне».**
**15.05, 16.25 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**19.40 Серыял «Дзікі».**
**22.35** «Вынікі дня».
**23.05 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы».**

### 8 канал

**7.00, 14.25, 19.30, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.35 Серыял «Уцёкі».**
**8.50, 18.10 Серыял «Абацтва Даўнтан».**
**9.40 Серыял «На дарозе».**
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Трылер «Аблога».**
**12.50 Серыял «Каўчэг».**
**14.15, 16.20, 18.00, 19.20, 21.00** «Хатняя крама».
**14.30 Серыял «Нашчадкі».**
**16.35 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Меладрама «Вяртанне ў блакітную лагуну».**
**23.00 Серыял «Спартак».**

### ВТБ

**6.00, 17.00** «Лаві момант».
**7.00, 17.30, 23.10, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.30, 0.00, 3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.30** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00, 13.40** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Анжаліка».
**10.30, 15.00, 20.00** Серыял «Як я стаў рускім».
**11.30** Камедыя «На мора!»
**14.00, 1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**21.10** Камедыя «Лары Краўн».
**23.30, 4.00** «Уральскія пельмені».
**0.30, 3.00** «Дурні і дарогі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 20.15** «Сага аб Фарсайтах». Серыял.
**12.10** «Пісьмы з правінцыі». Балтыйск (Калінінградская вобласць).
**12.40** «Маленькія капітаны». Дак. серыял. Фільм першы.
**13.10, 23.50** «Следства вядуць знатакі». Тэлефільм.
**14.30** «Махмуд Эсамбаеў. Чарадзей танца».
**15.10, 21.05** «Справа Расіі». Дак. серыял.
**15.40** «Астравы». Марына Галдоўская.
**16.20** «Аркадзь Райкін». Дак. фільм.
**17.20** Сусветныя скарбы.
**17.35** Да юбілею аркестра. Уладзімір Федасееў і БСА імя П.І. Чайкоўскага ў Залатой зале Musikverein.
**18.35** «Хор — адзінства непадобных». Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** «Культурны адпачынак». Дак. серыял.
**21.35** «Абсалютны слых».
**22.15** «Алег Яфрэмаў. «Каб быў тэатр». Дак. фільм.
**23.45** Мастсавет.
**1.05** «Гаагскія ўдарнікі». Маскоўскі канцэрт.

### Настальгія

**6.00** «Акулы пяра». Анатоль Крупноў («Чорны абеліск»).
**6.40, 7.40, 8.20, 8.55, 11.20, 12.55, 14.45, 15.40, 17.00, 18.40, 20.35, 21.40, 23.00, 0.50, 2.30, 5.25** Музычная настальгія.
**7.30** «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма.
**8.00** Маст. фільм «Пералёт таварыша Чкалава праз Паўночны Полюс».
**8.45** Дак. фільм «Зірніце на твар».
**10.00** Маст. фільм «Ксенія, любімая жонка Фёдара».
**12.00** «СевАрхіў» з Севам Наўгародцавым: «Рускі рок». 2004 год.
**13.20** Маст. фільм «Чужыя пісьмы».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Кіначасопіс «Ералаш» — нашай маладосці». 2007 год.
**19.00** Маст. фільм «Рэспубліка ШКІД».
**20.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!» 1974 год.
**0.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. Памяці Паўла Смяяна. 2009 год.
**1.30** Канцэрт гуртоў «Машина времени» і «Цветы».
**3.00** «Быў час». 2009 год.
**4.00** Маст. фільм «Чужая радня».

### EuroSport 1

**4.00, 9.45** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**5.30, 10.35, 20.25, 2.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы сярод юнакоў (U-19).
**7.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**8.00** Watts.
**9.00** Футбол. Чэмпіянат MLS. Найлепшыя моманты.
**9.30, 0.00**Ралі-Рэйд «Шаўкоўы шлях».
**12.00, 18.45, 20.20** «Галоўны па футболе». Эрык Кантана.
**12.05, 18.50, 0.15** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы.
**13.30, 22.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс» з Лемондам.
**14.30, 15.15, 1.45** Веласпорт. «Тур дэ Франс».
**15.00, 18.15** Веласпорт. «Тур дэ Франс» — экстра.
**23.35** Аўтаспорт. Суперкубак Porsche.

### Камедыя

**0.40** «План Б». Камедыя.
**2.30** «Два ў адным». Камедыя.
**4.00, 14.00, 14.50, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**04.30** «Самае горшае Раства ў маім жыцці». Камедыя.
**6.10** «Лілі Давід». Камедыя.
**7.50** «Герой месяца». Камедыя.
**9.35** «Снежная нявеста». Камедыя.
**11.10** «Няўдачлівыя». Камедыя.
**12.45** «Шчаслівыя ў разводзе». Серыял.
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** «Пазнаёмцеся з Уолі Спарксам». Камедыя.
**17.55** «Госць». Камедыя.
**19.30** «Карсіканец». Камедыя.
**21.10** «Кахаю тваю жонку». Камедыя.
**22.55** «Школа зладзеяў 2». Камедыя.

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.25** «Доктар І...»
**7.55, 19.05, 1.45** «Курт Сеіт і Александра». Серыял.
**9.35, 3.55** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.30, 4.40** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.30** «Сляпая».
**12.30** «Шафа».
**13.20** «Тайныя знакі».
**14.20** «Каменская». Серыял.
**15.15** «Здзелка».
**15.50** «Ежа, я люблю цябе».
**16.55, 21.55** «Рэвізора».
**18.00** «Другое дыханне». Серыял.
**21.00, 0.55** «Жанна, пажані».
**22.50, 5.30** «Зоркі і містыка».
**23.25** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.10** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**3.25** «Нераскрытыя тайны».

### ТБ1000

**6.10, 14.10** Камедыя «Прасцячка».
**8.10, 3.55** Драма «Нябачны бок».
**10.25, 2.15** Камедыя «Мая жудасная нянька».
**12.10** Трылер «Айчым».
**16.10** Меладрама «Цяжкасці перакладу».
**18.05** Драма «Паганіні: Скрыпач Д'ябла».
**20.10** Меладрама «Снежанькія хлопчыкі».
**22.10** Фантастыка «Дзіця чалавечае».
**0.10** Трылер «Страчаны рай».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.35** Меладрама «Іронія кахання».
**8.20, 2.20** Драма «Пушкін: Апошняя дуэль».
**10.30, 4.30** Фантастыка «Індыга».
**12.20** Трагікамедыя «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца».
**14.15** Камедыя «Гараскоп на ўдачу».
**16.20** Трылер «Уцёкі».
**20.20** Камедыя «Дзень дурня».
**22.20** Меладрама «Афінскія вечары».
**0.20** Драма «Дачка».

### National Geographic

**6.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 8.25, 13.10, 17.50, 21.45, 1.40, 4.50** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40, 17.05** Гульні розуму.
**9.15, 14.00, 19.25** Навука будучыні.
**10.00, 14.45, 20.10** Сапраўдны геній.
**10.50** Золата ў халоднай вадзе.
**11.40** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**12.30** Незвычайныя промыслы.
**15.30** Міграцыі.
**16.20** Сіла племені.
**18.40** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**21.00, 0.50, 4.00** Чалавек супраць YouTube.
**22.30** 90-я. Дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**23.20, 2.30** Уварванне на Зямлю.
**0.05, 3.15** Жах у нябёсах.

### Discovery

**8.00** Паездка ўлегцы.
**9.00, 14.30, 21.00** Як гэта зроблена?
**9.30, 14.00, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.00, 17.00** Багажныя войны.
**11.00, 7.10** Выжыць разам.
**12.00, 22.00** Хуткія і гучныя.
**13.00, 6.20** Звышчалавечая навука.
**15.00, 5.30** Аўтальянцы.
**16.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Рачныя монстры.
**19.00** Голыя і напалоханыя.
**20.00** Выжыванне без купюр.
**23.00** Поўны фарсаж.
**0.00** Стальныя хлопцы.
**1.00** Інжынерыя немагчымага.
**2.00, 4.40** Гаражнае золата.
**3.50** Маланкавыя катастрофы.
**4.15** Сапраўдныя аферысты.

## Глядзі і слухай

# «Славянскі базар у Віцебску-2016» запрашае сяброў

**Адным з самых яркіх і відовішчных падзей у эфіры тэле- і радыёканалаў галоўнага медыяхолдынга краіны гэтым летам стане юбілейны XXV міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», які пройдзе з 14 па 18 ліпеня.**

Белтэлерадыёкампанія пакажа асноўныя мерапрыемствы "Славянскага базару», зробіць запіс лепшых канцэртных праграм для далейшага выкарыстання ў тэле- і радыёэфіры сваіх каналаў, а таксама для абмену відэа- і аўдыяматэрыяламі з замежнымі партнёрамі і калегамі.

Так у эфіры «Беларусь 1» і «Беларусь 24» 14 ліпеня гледачы ўбачаць цырымонію ўрачыстага адкрыцця «Славянскага базару ў Віцебску-2016». У вялікім канцэрце прымуць удзел вядомыя выканаўцы і калектывы — Ала Пугачова, Валерый Лявонцьеў, Ларыса Доліна, Максім Галкін, Крысціна Арбакайтэ, Сяргей Лазараў, Надзея Бабкіна і тэатр «Руская песня», балет Сяргея Мандрыка «Street-jazz» (Расія), Анатоль Ярмоленка, Алена Ланская, Пётр Ялфімаў, Руслан Аляхно, Карыне Асіран (Арменія), Мікалай Манола (Балгарыя), Дзімаш Кудайберген (Казахстан ), Саманта Ціна (Латвія), Радрыга дэ ла Кадэна (Мексіка) і многія іншыя.

Ужо 15 ліпеня вышэйназваныя тэлеканалы прапануюць прамую трансляцыю канцэртнай праграмы Акадэмічнага ансамбля песні і танца Расійскай арміі імя А.В. Аляксандрава «Саюзная дзяржава запрашае...». У гэты ж дзень на «Беларусь 2» гледачоў чакае паўфінал XXV Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2016». А 16 ліпеня «Беларусь 1» і «Беларусь 24» у прамым эфіры пакажуць фінал — удзельнікі конкурсу выступяць у суправаджэнні Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. У другім аддзяленні канцэрта гледачоў чакае сустрэча з «зоркамі» эстрады. 17 ліпеня паглядзім дзень другі фіналу XXV міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2016».

Урачыстае закрыццё фестывалю, якое адбудзецца 18 ліпеня, таксама пакажуць «Беларусь 1» і «Беларусь 24». У грандыёзным канцэрце прымуць удзел артысты з розных краін свету. Акрамя гэтага, гала-канцэрт «зорак» беларускай і расійскай эстрады «Віцебск збірае сяброў» выйдзе ў эфір тэлеканала «Двойкі» 16 ліпеня. Тут жа нас чакае канцэртная праграма "25 імгненняў лета», якая збярэ на адной сцэне ўладальнікаў гран-пры і лаўрэатаў міжнароднага конкурсу «Віцебск».

Шырока асвятляць віцебскі форум будзе Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі: сачыць за падзеямі міжнароднага форуму можна будзе ў выпусках навін, праграмах «Панарама» і «Галоўны эфір» на «Беларусь 1». Матэрыялы аб культурным форуме і эксклюзіўныя інтэрв'ю таксама будуць прадстаўлены ў праграме «Добрай раніцы, Беларусь!»

У прамым эфіры «Беларусь 2» зможам убачыць і спецвыпускі «ПІН_КОДа» непасрэдна з Віцебска. Штодзённы фестывальны дайджэст прадставіць і праграма «Калейдаскоп» на «Беларусь 3».

Традыцыйна актыўна будзе ўдзельнічаць у асвятленні падзей фестывалю мастацтваў і Беларускае радыё, у эфіры каналаў і студый якога запланавана вялікая колькасць тэматычных інфармацыйных і музычных праграм.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

## Серада, 13 ліпеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.40** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Гражанка».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20 Серыял «Ліст чакання».**
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Простае жыццё».**
**17.40 Дэтэктыў «Апошняя сустрэча».**
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00 Серыял «След».**
**0.35** Дзень спорту.
**0.50 Серыял «Дзявочае паляванне».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.10, 21.10** «Бітва экстрасэнсаў. Вайна тытанаў».
**11.05, 17.40 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**12.20, 18.50 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**13.15, 19.50 Серыял «Кухня».**
**14.25** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.10 Трылер «Закрытая школа».**
**17.10** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**20.55** Хачу ў тэлевізар!
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.25 Серыял «Чужаземка».**

### Беларусь 3

**8.00, 13.30, 18.40, 21.05** «Калейдаскоп».
**8.15** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**8.20, 17.10 «Нестар Бурма». Серыял.**
**9.50, 19.40 «Архіў смерці». Драма.**
**10.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці рэжысёра, тэатральнага дзеяча Андрэя Андросіка.
**11.20 «Прыгоды ў горадзе, якога няма». Казка.**



**12.40** «Калейдаскоп».
**13.00** «Ён недзе тут... Успаміны пра Юрыя Марухіна». Дак. фільм.
**13.25 «Цішыня». Драма.**
**14.55** «Мартконтакт-2015». «Прадчуванне кахання». Дак. фільм.
**15.25 «Князь Юрый Даўгарукі». Драма.**
**19.00, 21.20** «Паляўнічыя на нацыстаў». Дак. фільм.
**20.40** «Калыханка».
**22.00 «Мёртвы сезон». Драма.**

### Беларусь 5

**7.20, 19.25, 21.55** PRO спорт. Навіны.
**7.30** Спорт-кадр.
**8.00** Валейбол. Кваліфікацыя да маладзёжнага чэмпіянату Еўропы. Мужчыны. Беларусь — Славакія.
**10.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Другі кваліфікацыйны раўнд. Першы матч. БАТЭ (Беларусь) — СІК (Фінляндыя).
**11.55** Валейбол. Кваліфікацыя да маладзёжнага чэмпіянату Еўропы. Мужчыны. Беларусь — Данія.
**14.00, 19.35, 22.05** Тэніс. Турнір WTA. Бухарэст.
**21.35** Козел пра футбол.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Гэта Я».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.20** «Адваротны адлік».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Практыка».**
**22.50** «Давай пажэнімся!»
**23.50 Маст. фільм «Выхадкі ў стардаўнім духу».**
**1.10** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.00** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Тэрыторыя памылак».
**15.30** «Вадзіць па-руску».
**16.10** «Аўтапанарама».
**16.50 «Следакі». Серыял.**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.50 «Меч». Серыял.**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Медыцынская праўда».
**9.30 Серыял «Марскі патруль».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 19.20 Серыял «Метад Фрэйда».**
**16.20, 3.05** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**16.50, 3.30** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20 Серыял «Невідзімкі».**
**22.10 Маст. фільм «Дачка якудзы».**
**23.50** Ток-шоу «Слова за слова».
**0.40 Маст. фільм «Сцерва для чэмпіёна».**
**2.35** Дак. серыял «Іншы свет».
**4.00 Маст. фільм «Настаўнік».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.10 Серыял «Белая гвардыя».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Тайны следства».**
**19.10, 20.50 Серыял «Прыгожае жыццё».**
**21.55, 23.10 Серыял «Сястра мая, Любоў».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.20, 22.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**14.15 Серыял «Ціхае паляванне».**
**15.05, 16.25 Серыял «Мянтоўскія вайны».**
**19.40 Серыял «Дзікі».**
**22.35** «Вынікі дня».
**23.05 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы».**

### 8 канал

**7.00, 14.25, 19.30, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.15, 19.35 Серыял «Уцёкі».**
**8.35, 18.05 Серыял «Абацтва Даўнтан».**
**9.40 Серыял «На дарозе».**
**10.40** «Адшукваецца адпачынак».
**11.10 Баявік «Абрабаванне па-італьянску».**
**12.55 Серыял «Каўчэг».**
**14.20, 15.55, 18.00, 20.55** «Хатняя крама».
**14.30 Серыял «Нашчадкі».**
**16.25** «Свой фермер. Другі сезон».
**16.45 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**18.55** «Мой любімы гадавалец».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Пераправа».**



**23.00 Серыял «Спартак».**

### ВТБ

**6.00, 17.00, 4.00** «Лаві момант».
**6.30, 17.30, 23.00, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00, 0.00, 23.30, 3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.30** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00, 13.40** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Анжаліка».
**10.30, 15.00, 20.00** Серыял «Як я стаў рускім».
**11.30** Камедыя «Лары Краўн».
**14.00, 1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**21.10** Фантастыка «Ультрафіялет».
**0.00** Еўрапейскі покерны турнір.
**0.50, 3.00** «Дурні і дарогі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 20.15** «Сага аб Фарсайтах». Серыял.
**12.10** «Пісьмы з правінцыі». Чыта (Забайкальскі край).
**12.40** «Маленькія капітаны». Дак. серыял.
**13.10, 23.50** «Следства вядуць знатакі». Тэлефільм.
**14.45, 18.20** Сусветныя скарбы.
**15.10, 21.05** «Справа Расіі». Дак. серыял.
**15.40** 95 гадоў Расійскаму акадэмічнаму маладзёжнаму тэатру. «Там, дзе дзяцінства не канчаецца...» Дак. фільм.
**16.20** «Алег Яфрэмаў. «Каб быў тэатр». Дак. фільм.
**17.35** Да юбілею аркестра. Уладзімір Федасееў і БСА імя П.І. Чайкоўскага ў Залатой зале Musikverein.
**18.35** «Гіпербалоід інжынера Шухава». Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** «Культурны адпачынак». Дак. серыял.
**21.35** «Абсалютны слых».
**22.15** «Міхаіл Ульянаў. Хроніка адной ролі». Дак. фільм.
**23.20** «Рафаэль». Дак. фільм.
**23.45** Мастсавет.
**1.25** Сімфанічны аркестр RAI. Творы С. Рахманінава.

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Рускі рок». 2004 год.
**6.55, 8.45, 9.40, 11.00, 12.40, 14.35, 15.40, 17.00, 20.50, 21.40, 23.00, 0.40, 1.40, 2.20, 2.55, 5.20** Музычная настальгія.
**7.20** Маст. фільм «Чужыя пісьмы».
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Кіначасопіс «Ералаш» — нашай маладосці». 2007 год.
**13.00** Маст. фільм «Рэспубліка ШКІД».
**14.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!» 1974 год.
**18.00** «Спяём, сябры!» з Таццянай Візбар: Сяргей Нікіцін. 2007 год.
**19.00** Маст. фільм «Журналіст». 1-я серыя.
**0.00** «Акулы пяра». Анатоль Крупноў («Чорны абеліск»).
**1.30** «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма.
**2.00** Маст. фільм «Пераход таварыша Чкалава праз Паўночны Полюс».
**2.45** Дак. фільм «Зірніце на твар».
**4.00** Маст. фільм «Ксенія, любімая жонка Фёдара».

### EuroSport 1

**4.00, 13.30, 15.15, 1.15** Веласпорт. «Тур дэ Франс».
**5.30, 10.45, 19.05, 23.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы сярод юнакоў (U-19).
**7.00, 20.15** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы.
**8.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**9.30, 1.00** Ралі-Рэйд «Шаўковы шлях».
**9.45, 22.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс» з Лемондам.
**12.00, 21.45** «Спорт знутры».
**12.30, 2.30** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**15.00, 18.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс» — экстра.
**19.00** «Галоўны па футболе». Эрык Кантана.
**22.15** Watts.

### Камедыя

**0.35** «Старыя разбойнікі». Камедыя.
**2.10** «Супер Лола». Камедыя.
**3.45, 14.00, 14.50, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**4.25** «Пра што маўчаць дзяўчаты?» Камедыя.
**6.00** «Снежная нявеста». Камедыя.
**7.35** «Па той бок». Меладрама.
**9.25** «Самае горшае Раство ў маім жыцці». Камедыя.
**11.00** «Паўднёвыя моры». Камедыя.
**12.45** «Прападобны». Серыял.
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** «Аксамітныя ручкі». Камедыя.
**17.45** «Школа зладзеяў». Камедыя.
**19.30** «Чужое вяселле». Меладрама.
**21.05** «Мамусі». Камедыя.
**22.45** «Шалёныя выкладчыкі». Камедыя.

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.30** «Доктар І...»
**8.00, 19.00, 1.45** «Курт Сеіт і Александра». Серыял.
**9.40, 3.55** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.35, 4.40** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.35** «Сляпая».
**12.35** «Шафа».
**13.30** «Тайныя знакі».
**14.30** «Каменская». Серыял.
**15.25** «Здзелка».
**15.55** «Жанна, пажані».
**16.55, 21.50** «Рэвізора».
**17.55** «Другое дыханне». Серыял.
**20.55, 0.55** «Блокбастары».
**22.50, 5.30** «Зоркі і містыка».
**23.25** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.10** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**3.25** «Нераскрытыя тайны».

### TV 1000 ТБ1000

**6.10, 18.15** Трылер «Айчым».
**8.10, 4.20** Фантастыка «Дзіця чалавечае».
**10.10, 2.10** Меладрама «Снежаньскія хлопчыкі».
**12.10** Трылер «Страчаны рай».
**14.15** Драма «Нябачны бок».
**16.30** Камедыя «Мая жудасная нянька».
**20.10** М/ф «Легенды начных вартавых».
**22.10** Фантастыка «Востраў».
**0.30** Трылер «Драйвер на ноч».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.55** Камедыя «М + Ж».
**8.10, 1.40** Камедыя «Дзень дурня».
**10.10, 3.15** Меладрама «Афінскія вечары».
**12.10** Драма «Аты-баты, ішлі салдаты...»
**13.45** Казка «12 месяцаў. Новая казка».
**15.20** Драма «Пушкін: Апошняя дуэль».
**17.15** Фантастыка «Індыга».
**20.20** Меладрама «Як выйсці замуж за мільянера».
**22.20** Іншае кіно. Драма «Іншае неба».
**0.10** Камедыя «Раскоп».
**5.00** М/ф «Бабай».

### National Geographic

**6.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 10.00, 13.15, 14.50, 20.10, 5.40** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40, 12.25, 17.10, 21.00, 1.00, 4.05** Незвычайныя промыслы.
**9.10, 14.00, 19.25** Чалавек супраць YouTube.
**10.50** Золата ў халоднай вадзе.
**11.35** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**15.35** Міграцыі.
**16.20** Сіла племені.
**18.40** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**22.30** 90-я. Дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**23.20** Уварванне на Зямлю.
**0.10, 3.20** Жах у нябёсах.
**2.30** Паранармальнае.

### Discovery

**8.00** Звышчалавечая навука.
**9.00, 14.00, 21.30** Як гэта ўстроена?
**9.30, 14.30, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.00, 17.00** Гаражнае золата.
**11.00, 7.10** Рачныя монстры.
**12.00** Аўтальянцы.
**13.00, 6.20** Як устроены Сусвет.
**15.00, 5.30** Што ў вас у гаражы?
**16.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Стальныя хлопцы.
**19.00** Хуткія і гучныя.
**20.00** Поўны фарсаж.
**22.00** Іржавая імперыя.
**23.00** Бітвы за кантэйнеры.
**0.00** Паляўнічыя на склады.
**1.00** Багажныя войны.
**2.00, 4.40** Паляўнічыя на рэліквіі.
**3.50** Маланкавыя катастрофы.
**4.15** Сапраўдныя аферысты.

## Усходні гараскоп на

**АВЕН.** Звядзіце да мінімуму кантакты з людзьмі, якія вам не вельмі прыемныя. На працягу тыдня верагодны перапады настрою, якія могуць прывесці да творчага крызісу. Хоць і не без цяжкасцяў, але ўсё ж атрымаецца ажыццявіць свае праекты. У другой палове тыдня паспрабуйце не пачынаць новых спраў, лепш як след адпачніце. У выхадныя будзе магчымасць не толькі добра правесці час у коле сяброў, але і наладзіць патрэбныя кантакты, пазнаёміцца з цікавымі людзьмі.

**ЦЯЛЕЦ.** Адна з галоўных задач для вас цяпер — усвядоміць, што практычна ўсё залежыць ад вас. Добры перыяд для духоўных пошукаў, творчы парыў прынясе прыбытак. Добразычлівасць начальства можа спрыяць прасоўванню па кар'ернай лесвіцы. А таксама можаце атрымаць прапанову новай, высокааплатнай працы. Пятніца і выхадныя — удалы момант для паездак і ўсіх спраў, звязаных з падарожжамі і далёкімі краінамі.

**БЛІЗНЯТЫ.** На гэтым тыдні адчуванне ўласнай значнасці з'явіцца ў вас не на пустым месцы, і выкарыстоўваць плённы перыяд неабходна напоўніцу. Поспех у справах будзе шмат у чым залежаць ад вашых арганізатарскіх здольнасцяў, але наўрад ці ўсё абыдзецца без канкурэнтнай барацьбы. Звыклы імідж будзе мець патрэбу ў некаторай карэкцыі. Перашкоды і праблемы, якія могуць з'явіцца ў пачатку тыдня, не павінны засмучаць, бо, пачынаючы з серады, усё павернецца на вашу карысць. Непрацяглая адзінота ў канцы тыдня дазволіць вам раскрыць свой творчы патэнцыял.

**РАК.** Займіцеся духоўным развіццём і самаадукацыяй. Аналізуйце новую і важную для вас інфармацыю. У панядзелак і ў сераду будзе ўдалым абмеркаванне вашых ідэй і прапаноў з начальствам. У аўторак поспех прынясуць дзелавыя сустрэчы і перамовы. Вас могуць зацікавіць нечаканыя прапановы. У выхадныя рыхтуйцеся да сустрэчы са старымі сябрамі. Вы будзеце вельмі красамоўнымі, лёгка і даходліва выказваць свае думкі, таму пакарыце ўсіх сваім талентам расказчыка.

**ЛЕЎ.** Час актыўных пачынанняў, новых ідэй і іх рэалізацыі. Таварыскасць і чароўнасць дапамогуць вам на гэтым тыдні наладзіць неабходныя кантакты, знайсці новыя дзелавыя сувязі і дадатковыя крыніцы даходу. Хоць не ўсе вашы ідэі сустрэнуць разуменне, але ў цэлым вас будзе чакаць поспех. Беражыце добрыя адносіны са старымі сябрамі, нават калі цяпер у вас з'явілася нямала новых. У сераду не варта гнацца за міражом, лепш паспрабуйце забяспечыць сабе і навакольным упэўненасць у сумленнасці вашых намераў.

**ДЗЕВЫ.** Стан спраў на працы на гэтым тыдні будзе вельмі паказальным, дэманструючы ступень вашай прафесійнай прыдатнасці і перспектывы кар'ернага росту. Старайцеся не паказваць навакольным сваю нервовасць і раздражняльнасць. Зараз не варта давяраць новым ідэям і планам, бо ёсць верагоднасць трапіць у пастку, расстаўленую зайздроснікамі. Пятніца характэрная тым, што ў гэты дзень можна знайсці ключык да будучыні і асабістага шчасця.

## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** На гэтым тыдні вы рызыкуеце занадта позна ўсвомніць адзін з жыццёвых урокаў, які мог бы вам дапамагчы. Сцеражыцеся неабдуманых учынкаў, нават калі для таго, каб іх прааналізаваць, давядзецца не спаць начамі. Нядрэнна было б паназіраць за вашым наваколлем, каб мець правільнае ўяўленне пра людзей, з якімі вы маеце зносіны. У суботу вам трэба будзе самастойна выкручвацца з сітуацыі, у якую вы ўцягнулі і сябе, і блізкіх людзей. У нядзелю паспрабуйце падумаць пра сэнс жыцця: вам можа адкрыцца новае значэнне звыклых рэчаў і адносін.

**СКАРПІЁН.** У вас засталіся нявырашаныя праблемы; пажадана пастарацца справіцца з імі, каб не цягнуць за сабой такі цяжкі груз. Нельга адкладаць на потым увесь час і пазбягаць змен у сваім жыцці, нават калі ў цэлым вас і так усё задавальняе. Вам неабходна актыўная дзейнасць і самадысцыпліна — ад гэтых якасцяў залежаць новыя перспектывы. У сярэдзіне тыдня вас чакае фінансавы поспех і прыемныя хвіліны сустрэчы з каханым чалавекам. Найбольш спрыяльны для вас дзень — серада, неспрыяльны — нядзеля.

**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні пажадана трымацца ў тайне свае найбліжэйшыя планы. За шчасце часам даводзіцца пазмагацца. Калі вы ўпэўнены ў сваёй пазіцыі і разумееце, чаго хочаце, то чаму б не ўвязацца ў адстойванне сваіх жаданняў? Верагодна, спачатку зрабіць гэта будзе нялёгка, затое можна будзе суцяшацца тым, што за не самай удалай паласой у жыцці вас чакае паляпшэнне сітуацыі. У другой палове тыдня можна пачынаць павольнае, але няўхільнае прасоўванне да ажыццяўлення сваіх амбіцыйных планаў. Галоўнае — не ляну́йцеся і праявіце энергію і актыўнасць.

**КАЗЯРОГ.** Поспех на гэтым тыдні ўсміхнецца вам, але адной яго ўсмешкі недастаткова, неабходна і нешта зрабіць самому — у гэтым і загвздка. Не дазваляйце карыстацца вашай дабрынёй у карыслівых мэтах, умейце сказаць «не», калі гэта неабходна. У сітуацыі, якая склалася, вам вельмі дапамогуць гнуткасць мыслення і ўменне адчуваць сур азмоўцу. Не давайце волю пачуццям і эмоцыям пры зносінах з начальствам. Вашы тайны могуць выплысць на паверхню, будзьце да гэтага гатовыя.

**ВАДАЛЕЙ.** У працы вам спатрэбіцца рашучасць, ініцыятыва і сабранасць. Панядзелак — выдатны дзень для добраўпарадкавання свайго дома. У аўторак ёсць шанц з'яўлення новых партнёраў — і ў справах, і ў каханні. Пятніца можа стаць досыць напружаным днём, вы можаце камусьці спатрэбіцца для вырашэння важных спраў. Па магчымасці не адмаўляйце ў дапамозе. Сустрэчы з сябрамі ў выхадныя падымуць настрой, вы даведаецеся шмат новага і цікавага.

**РЫБЫ.** На гэтым тыдні вы будзеце падсвядома імкнуцца да ўдзелу ў разнастайных авантурах. Невядома, ці апраўдаецца рызыкоўная дзейнасць паспяховым дасягненнем мэты, аднак бура незабыўных перажыванняў вам гарантавана. У сярэдзіне тыдня не чакайце выканання ўсіх жаданняў: некаторыя планы хоць і рэалізуюцца, але з шэрагам паправак. У канцы тыдня вы будзеце здольныя згладзіць практычна любыя канфліктныя сітуацыі.

## Чацвер, 14 ліпеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.10** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Гранчака».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20 Серыял «Ліст чакання».**
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Простае жыццё».**
**17.40 Дэтэктыў «Апошняя сустрэча».**
**19.20, 0.30** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**22.00** Урачыстае адкрыццё XXV Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».
**0.50** Дзень спорту.
**1.00 Серыял «Дзявочае паляванне».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.10, 21.10** «Бітва экстрасэнсаў. Вайна тытанаў».
**11.10, 17.45 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**12.25, 18.55 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**13.25, 19.55 Серыял «Кухня».**
**14.30** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.10 Трылер «Закрытая школа». Заключная серыя.**

### Беларусь 3

**17.10** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.45 Серыял «Чужаземка».**

**7.40, 12.05, 18.40, 21.00** «Калейдаскоп».
**7.55, 17.15 «Нестар Бурма». Серыял.**
**9.20, 19.40 «Архіў смерці». Драма.**



**10.20** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Барыса Аракчэева.
**10.45 «Рускія браты». Драма.**
**12.20 «Мёртвы сезон». Драма.**
**14.30** «Сіла веры».
**15.00 «Чорны бусел». Драма.**
**16.35** «Кіно і час». Катастрофа на Чарнобыльскай АЭС.
**19.00, 21.55** «Паляўнічыя на нацыстаў». Дак. фільм.
**20.40** «Калыханка».
**21.55 «Коні ў акіяне». Драма.**

### Беларусь 5

**7.25, 19.25, 21.35** PRO спорт. Навіны.
**7.35** Козел пра футбол.
**7.55** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Вячэрняя сесія.
**14.00, 19.35** Тэніс. Турнір WTA. Бухарэст.
**21.45** «Адзін дзень на шляху да Алімпа».
**22.15** Змешаныя адзінаборствы. Адкрыты чэмпіянат Беларусі.

### АНТ

